WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

17 СНЕЖНЯ 2011 г. СУБОТА
№ 241 (27105)
Кошт 800 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Надвор'е

## ПАРЫВІСТЫ ВЕЦЕР І МОЦНЫ СНЕГ З ДАЖДЖОМ

**У выхадныя сур'ёзны актыўны цыклон пачне рухацца ў паўночныя раёны Польшчы, а яго атмасферныя франты прынясуць на тэрыторыю Беларусі інтэнсіўныя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Гэты цыклон будзе гаспадарыць у нас і ў нядзелю, аднак на тэрыторыю Беларусі завітае ўжо больш халоднае паветра з боку Паўночнай Атлантыкі. Тэмпература паветра на працягу сутак 1—4 марозу. Захаваецца парывісты вецер — 15—20 м/с. Ападкі будуць ужо ў выглядзе мокрага снегу. У панядзелак на поўначы краіны будзе невялікі снег, мокры снег. Месцамі ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература ўначы на панядзелак ад мінус 3 да плюс 2 градусаў, удзень — ад мінус 2 да плюс 4. У аўторак ападкаў ужо амаль не будзе, толькі на паўднёвым усходзе невялікі мокры снег. Уначы — 0—5 марозу, удзень — каля 0.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ УСТОЙЛІВЫ І НЕІНФЛЯЦЫЙНЫ РОСТ ЭКАНОМІКІ»

**Другі дзень пастаянна дзеючага семінара кіруючых работнікаў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржорганаў пачынаўся задоўга да ўласна пленарнага пасяджэння. Выступленне кіраўніка дзяржавы напярэдадні, наведванне прадпрыемстваў, дзе ўдзельнікі змаглі на свае вочы азнаёміцца з лепшым вопытам вытворчасці тавараў, якія замяшчаюць імпарт, патрабавала абмеркавання. Абмен уражаннямі распачаўся ўжо ў фае Палаца Рэспублікі, дзе была наладжана спецыялізаваная выстава. Яе экспаненты карысталіся значна большай увагай, і куды часцей тут гучала слова «маркетынг».**





Фота БЕЛТА.

Пра неабходнасць глыбокага аналізу і навукова падыходу да пытанняў імпартазамяшчэння ў кожным канкрэтным выпадку гаварыў у сваім выступленні і **старшыня Прэзідыума НАН Анатоль РУСЕЦКІ**. Паводле яго высноў, у Беларусі сфарміраваны асноўныя прынцыпы імпартазамяшчэння. Яно павінна быць эканамічна мэтазгодным, інавацыйным і, разам з тым, кіруемым і стымулявацца дзяржавай.

Вытворчы сектар Беларусі застаецца адным з найбольш імпартаёмістых у Еўропе, канстатаваў кіраўнік НАН. У фактычных цэнах імпартаёмістасць вытворчасці ў 2010 годзе склала 22,3%. У той жа час пры прыняцці рашэння аб скарачэнні прамежкавага імпарту трэба вельмі дакладна планаваць аб'екты імпартазамяшчэння, паколькі ўдзельная вага імпарту складае 35% у спажываных выдатках, 45% — у інвестыцыях і 43,7% — у экспарце.

«Варта не толькі скарачаць імпарт, а ў першую чаргу выкарыстоўваць прамежкавы імпарт для нарошчвання выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі з пераважнымі пастаўкамі на экспарт», — адзначыў Анатоль Русецкі.

Кіраўнік НАН указаў на тое, што ў краіне ёсць магчымасць істотна павысіць аб'ём экспарту за кошт росту эфектыўнасці эканомікі, і перш за ўсё ў галінах, якія маюць найбольшую велічыню патэнцыяльнага прыросту дабаўленай вартасці на аднаго занятага. Размова пра вядомыя сусветныя брэнды — МАЗ, БелАЗ, МТЗ, Атлант... Паводле слоў Анатоля Русецкага, пры дасягненні сярэднееўрапейскага ўзроўню прадукцыйнасці па дабаўленым кошце ў вытворчасці машын і абсталявання магчымы рост гэтага паказчыка больш як у 4 разы! Менавіта ў галінах, якія патрабуюць стварэння інавацыйнай эканомікі, у Беларусі ёсць перспектывы ўваходжання ў лік развітых краін Еўропы, лічыць прадстаўнік навукі.

Старшыня Прэзідыума НАН прапанаваў распрацаваць закон аб прамысловай палітыцы і Дзяржпраграму імпартазамяшчэння. Пазіцыя Акадэміі навук наступная: галіновых праграм недастаткова, пытанне стаіць больш востра, неабходна больш эфектыўна выкарыстоўваць сістэмныя, макраэканамічныя інструменты.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад вучоных распрацоўваць і развіваць запатрабаваныя рынкам інавацыі. Ён падкрэсліў важнасць унёску навукі ў рэалізацыю праектаў па імпартазамяшчэнню.

«Тое, што павінны самі выраблядь, паступае па імпарце, на гэта выдаткоўваюцца велізарныя грошы, — адзначыў Прэзідэнт. — Без вучоных мы нічога зрабіць не зможам. Ці робіць Акадэмія навук, вучоныя ўсё тое, што патрэбны зрабіць? Вядома, не робяць».

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў павышэння эфектыўнасці навуковых праектаў. Прыйшоў час «паварушыцца», а не толькі патрабаваць даплаты за навуковыя званні. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, даплаты будуць атрымліваць толькі тыя вучоныя, хто будзе прыносіць канкрэтны вынік. Патрабаванні да кіраўніцтва НАН і ўсёй навуковай супольнасці ў цэлым будуць яшчэ больш жорсткімі.

Прэзідэнт даручыў урэзаць на 25-30% бюджэт Акадэміі навук на 2012 год.

«Няхай не напалову, але на 25-30% трэба ўрэзаць. Да таго часу, пакуль мы будзем з бюджэту карміць не толькі вучоных, але і іншых, яны нічога рабіць не будуць. Я нічога новага не сказаў — гэта жыццё», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Як канстатаваў **міністр гандлю Валянцін ЧАКАНАЎ**, доля імпартных харчовых тавараў на беларускім рынку скарачаецца, у той час як доля нехарчовых тавараў — наадварот, расце. Ён таксама праінфармаваў, што дзякуючы рэалізацыі імпартазамяшчальных праектаў сёлета доля імпарту ў таварных рэсурсах зменшылася ў параўнанні з 2006 годам па макаронных вырабах — у 1,5 раза, халадзільніках і маразільніках — у 2,1 раза, пральных машынах — у 2,5 раза, тытунёвых вырабах — у 7,5 раза.

Вялікую ўвагу Мінгандль надае развіццю экспарту беларускай прадукцыі. Развіваюцца новыя падыходы па фарміраванні беларускай тавараправоднай сеткі за мяжой. Ствараюцца шматпрофільныя суб'екты ТПС галіновага і рэспубліканскага ўзроўню. Паводле слоў міністра, прыкладам можа служыць ТАА «Армяна-беларускі гандлёвы дом». Яго доля ў агульным аб'ёме экспарту беларускай прадукцыі ў Арменію ўжо дасягнула 16%.

Аляксандр Лукашэнка пракрытыкаваў работу Мінгандлю на знешніх рынках. Паводле яго слоў, нават тыя станоўчыя вынікі, якія дасягнуты, у многім заслуга вышэйшага кіраўніцтва краіны.

«У Міністэрстве гандлю павінны круціцца, а не складаць паперы», — адзначыў Прэзідэнт. Ён запатрабаваў практычных дзеянняў ад міністэрства, а таксама даручыў разгледзець мэтазгоднасць яго структурных пераўтварэнняў. Перад Мінгандлем павінны быць пастаўлены канкрэтныя задачы. Многае за апошні час змянілася. Частку функцый міністэрства ўзялі на сябе органы мясцовай улады. У іх для гэтага сфарміраваны адпаведныя структуры, праводзіцца антыманапольная палітыка, наладжаны кантроль за ўнутраным рынкам. Таму задача Мінторга па рабоце на ўнутраным рынку істотна звузілася, а вось што датычыцца знешняга гандлю — сюды і трэба перанакіраваць асноўныя сілы міністэрства.

Агучыць сваё бачанне і падыходы да імпартазамяшчэння ў рамках семінара змаглі кіраўнікі і іншых міністэрстваў, канцэрнаў, прадпрыемстваў. Некаторыя з іх узнялі вострыя пытанні, у абмеркаванні якіх актыўны ўдзел узяў кіраўнік дзяржавы, іншыя службовыя асобы. Гэта і праблема сезоннага дэфіцыту чыгуначных вагонаў (адпаведна — і павелічэнне іх вытворчасці), і тэхпераўзбраенне Аршанскага льнокамбіната, і пытанні нядобрасумленнага правядзення закупак прадукцыі, на карысць імпарту...

Падводзячы вынікі семінара, кіраўнік дзяржавы яшчэ раз падкрэсліў: для ўрада і ўсёй вертыкалі задача нумар адзін на гэтую пяцігодку — выхад на станоўчае сальда знешняга гандлю. Інструментам дасягнення галоўнай мэты і важнейшым элементам эканамічнай палітыкі з'яўляецца імпартазамяшчэнне. Залежнасць ад знешніх паставак сыравіны і энерганосьбітаў асабліва актуальным робяць пытанне жорсткай эканоміі валютных сродкаў.

«Хтосьці можа сказаць, што, маўляў, многія краіны жывуць з адмоўным сальда і іх дабрабыт значна вышэйшы. Аднак у чым іх сакрэт? У пастаянных запазычаннях?.. А ў канчатковым выніку што? Краіны становяцца на мяжу прорвы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Сёння ўвесь свет бачыць, што адбываецца з эканомікамі знешне працвітаючых еўрапейскіх дзяржаў, якія абралі такі шлях.

Беларусь таксама скарысталася замежнымі крэдытамі. Аднак, як заўважыў Прэзідэнт, тыя запазычанні накіраваны на інавацыйнае развіццё. Яны сыгралі сваю асноўную ролю — створаны новыя вытворчасці. Мы не закупляем у ранейшых аб'ёмах аўтобусы, грузавыя аўтамабілі, зернеўборачныя камбайны і сельгасабсталяванне, многія спажывецкія тавары і харчаванне. Укладзеныя сродкі пачынаюць даваць аддачу!

«Ураду трэба прадоўжыць работу па канцэнтрацыі рэсурсаў на стварэнне высокаэфектыўных імпартазамяшчальных і экспартаарыентаваных вытворчасцяў», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы. На яго думку, калі сканцэнтраваць патэнцыял галін і рэгіёнаў, Беларусь у стане дабіцца станоўчага сальда гандлёвага балансу ў 1,5 млрд долараў ЗША. Менавіта такі ўзровень гарантуе стабільнасць рэсурснага забеспячэння эканомікі і з'яўляецца важнейшым індыкатарам эканамічнай бяспекі.

Разгляд комплексу пытанняў на семінары выявіў шэраг прычын, якія дагэтуль перашкаджалі эфектыўна рэалізоўваць імпартазамяшчальныя праграмы. Сярод іх — недастатковая прапрацоўка праектаў на стадыі іх планавання і падрыхтоўкі, значныя выдаткі на інвестыцыйны імпарт і вытворчасць, недастатковая развітасць інфраструктуры беларускага экспарту, невысокая эфектыўнасць тавараправодных сетак, адсутнасць належнай каардынацыі паміж дзяржорганамі пры рэалізацыі прадукцыі.

«Больш за тое, імпарт для шэрагу кіраўнікоў і спецыялістаў стаў своеасаблівай кармушкай, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Хоць сістэма тэндараў і конкурсаў існуе, знаходзяцца спрытнякі, якія пад усялякімі нагодамі шукаюць лазейкі. Дык вось, папярэджваю. Любыя факты неабгрунтаванага імпарту будуць расцэньвацца як сур'ёзнае парушэнне з адпаведнымі наступствамі».

Гэты год паказаў, які негатыўны ўплыў на развіццё краіны аказваюць знешнеэканамічныя дыспрапорцыі. Гэта датычыцца валютнага рынку, стабільнасці нацыянальнай валюты, плацежаздольнасці краіны. Па гэтых прычынах, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, імпартазамяшчэнне і дасягненне станоўчага сальда знешняга гандлю пераходзяць з эканамічнай катэгорыі ў палітычную.

СТАР. 2

## Беларусь і Расія ўзгаднілі ўмовы пастаўкі расійскай нафты на беларускія НПЗ на 2012—2015 гады

**Канцэрнам «Белнафтахім» паспяхова завершаны перагаворы аб умовах пастаўкі расійскай нафтавай сыравіны на нафтаперапрацоўчыя заводы Беларусі. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміла прэс-сакратар канцэрна Марына Касцючэнка.**

Пратакол аб узгадненні ўмоў нафтавых паставак падпісалі ў Маскве 15 снежня 2011 года ад беларускага боку кіраўнікі канцэрна «Белнафтахім», ААТ «Мазырскі НПЗ» і ААТ «Нафтан», ад расійскага боку — кіраўнікі кампаніі асноўных пастаўшчыкоў нафты ў Беларусь ААТ «Газпрамнафта», ААТ «Лукойл», ААТ «Раснафта», ААТ «Сургутнафтагаз» і ААТ «ТНК-ВР».

«Дакументам замацоўваецца пераход на новую формулу цэнаўтварэння на нафтавую сыравіну ў адпаведнасці з Дагаворам аб парадку арганізацыі, кіравання, функцыянавання і развіцця агульных рынкаў нафты і нафтапрадуктаў Беларусі, Казахстана і Расіі, падпісаным у рамках стварэння Адзінай эканамічнай прасторы і які прадугледжвае непрымяненне бакамі ва ўзаемным гандлі колькасных абмежаванняў і вывазных мытных пошлін, а таксама іншых пошлін, падаткаў і збораў, маючых эквівалентнае значэнне», — удакладніла Марына Касцючэнка. У канцэрне ўпэўнены, што новая формула «надае фінансавую мэтазгоднасць пастаўкам беларускіх нафтапрадуктаў у Расіі». На думку экспертаў, гэтыя ўмовы з'яўляюцца лепшымі, найбольш выгаднымі для нашай краіны за апошнія 5 гадоў.

«Прамая лінія»

## НОЖКІ Ў «СЕТАЧКУ»

«Гарачая лінія» газеты «Звязда» і радыёстанцыі «Мір» будзе прысвечана тэме прафілактыкі і лячэння варыкознага расшырэння вен. Чаму нават у маладых жанчын і мужчын на нагах з'яўляюцца вузельчыкі, павуцінкі і сетачкі? Што ёсць проста касметычны дэфект, а што — захворванне, якое трэба лячыць? Аб тым, ці існуюць эфектыўныя і не траўматычныя спосабы лячэння варыкозу, раскажа **кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры хірургіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Ігнат Адамавіч ДАВІДОЎСКІ.**

«Гарачая лінія» адбудзецца **19 снежня,** у панядзелак, з **12.15 да 12.45** у студыі радыёстанцыі «Мір» па нумары: **8 (017) 210 14 71.**

Адказы на ўсе пытанні будуць надрукаваны ў «Звяздзе».

**РАДЫЁ «МІР» У БЕЛАРУСІ**

| | |
|---|---|
| Мінск | 107,1 FM |
| Брэст | 106,6 FM |
| Віцебск | 101,8 FM |
| Гродна | 104,2 FM |
| Магілёў | 107,8 FM |
| Баранавічы | 98,4 FM |
| Бабруйск | 103,6 FM |
| Пінск | 103,2 FM |
| Салігорск | 104,3 FM |

ISSN 1990 - 763X

Павіншуйце
Вашых партнёраў
з Новым годам і Калядамі!
Сэрвіс друку
НАВАГОДНІХ
фірменных ПАШТОВАК
InterPrint.by
офіс (017) 298 41 68
МТС (029) 775 57 18
Мабільныя тэлефоны SNAMI® SNAMI.BY
ООО «ТЦ СНАМИ» УНП 100705382

ФІНансавы Тыдзень

## ТЫДЗЕНЬ РЭКОРДАЎ

**Сітуацыя з курсамі валют не перастае здзіўляць. У сярэдзіне тыдня ўпершыню са студзеня 2011 года курс еўра на міжнародных гандлёвых пляцоўках апусціўся ніжэй за 1,3 долара.**

Гэта было выклікана тым, што інвестары сталі скідаць еўра і купляць долары на фоне даўгавога крызісу ў Еўропе. Беларуская валютна-фондавая біржа таксама адрэагавала на сусветныя тэндэнцыі, «панізіўшы» еўрапейскую валюту да кошту ў 10990 беларускіх рублёў, што таксама незвычайна. Напрыканцы тыдня курс еўра падняўся толькі на 10 рублёў — да 11 тысяч. Далейшы лёс еўрапейскіх грошай цяжка вызначыць, але, згодна з даследаваннем Аналітычнага цэнтра EcooM, людзі вераць у распад еўразоны — 51,7 працэнта рэспандэнтаў выказалі такое меркаванне.

Долар таксама таннее: мінус 70 рублёў за тыдзень. Расійскі ж рубель пазбавіўся чатырох беларускіх. У выніку «амерыканец» стаў меншы на 0,8 працэнта, еўра —на 2,8, а расійская валюта — на 1,5.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.12.2011 г. (для б/н разлікаў)

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 8 450,00 | 1 чэшская крона | 433,40 |
| ▲1 еўра | 11 000,00 | 1 польскі злоты | 2 438,29 |
| 1 латвійскі лат | 15 761,98 | ▲1 расійскі рубель | 266,00 |
| 1 літоўскі літ | 3 184,59 | 1 украінская грыўня | 1 052,37 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 31,7701 |
| 10 UAH | 39,5667 |
| 10000 BYR | 37,5978 |
| EUR | 41,3933 |

Выстава

# ПА «ХЭНДМЭЙД» — НА «МЛЫН»!



Рэзчык па дрэве, скульптар з Нясвіжа Віктар Ульянаў са сваёй «Сям'ёй буслоў».

**Сапраўдны майстар — таленавіты ва ўсім. У гэтым у чарговы раз можна пераканацца, наведаўшы другі па ліку кірмаш народных промыслаў і рамёстваў «Млын», які распачаў сваю працу ў сталічным выставачным комплексе «БелЭкспа» па адрасе: вуліца Янкі Купалы, 27. Што ён і творца, і філосаф. І што яго дзейнасць павінна быць запатрабаванай, прастымуляванай у тым ліку і матэрыяльна. Інакш... Інакш майстар калі і не з'едзе ў тую ж суседнюю Расію, дык як мінімум па шэрагу прычын будзе працаваць на яе рынак, як расказвалі многія з удзельнікаў...**

...Рэзчык па дрэве, скульптар з Нясвіжа Віктар Іванавіч Ульянаў па прафесіі... урач. Яшчэ ў канцы 1960-х гадоў, будучы студэнтам медінстытута, скончыў студыю разьбы па дрэве пры мінскім Палацы прафсаюзаў і потым яе ж на працягу 2,5 года ўзначальваў. Заўсёды Віктара Іванавіча ў яго захапленні падтрымлівала жонка Лідзія Іосіфаўна.

— Я таксама напачатку вучылася ў медыцынскім, пакуль не абрала педагагічную прафесію. Памятаю пакойчык памерам літаральна два на два метры, мы з дзіцем, а муж нешта выразае, — прыгадала яна.

Пасля заканчэння медінстытута была праца на Магілёўшчыне, у Ветухноўскай участковай бальніцы, потым — Нясвіж. Тут з пасады галоўнага ўрача наш суразмоўца і пайшоў на пенсію. Трэба сказаць, што ўжо да гэтага часу Віктар Іванавіч меў шматлікія дыпломы выстаў-конкурсаў — і рэспубліканскіх, і тагачасных саюзных. Яго працы разыходзіліся па музеях. Майстар працуе з усімі пародамі драўніны — зрэшты, можа рэзаць і па костцы. Апроч іншых работ, яны з жонкай прывезлі на «Млын» велічную — і ў сэнсе духоўнасці, і ў сэнсе памераў — кампазіцыю «Сям'я буслоў».

— Упаў дуб, вельмі таўшчэзны. І яго аддалі мне. Сярэдзіна ў яго была чорнай, таму, паглядзіце, адну з птушак давялося рабіць з такім выгінам, — расказаў Віктар Іванавіч.





«Ландшафтныя кампазіцыі — мой лад жыцця», — кажа рамеснік з Самахвалавічаў Леанід Баркоўскі.

СТАР. 2

РОЗГАЛАС
АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

## ЦЯПЕР БІЗНЭС-КЛАСАМ — І Ў ОРШУ

**24 снежня Беларуская чыгунка адкрывае рэгулярны рух электрацягнікоў рэгіянальных ліній па маршруце Мінск — Орша.**

Як паведамілі ў прэс-службе магістралі, са сталіцы да канчатковай кропкі прызначэння электрацягнік бізнэс-класа даставіць пасажыраў за 2 гадзіны 18 хвілін. Прыпынкі прадугледжаны ў Смалявічах, Жодзіне, Барысаве, Крупках, Талачыне. Сучасны электрацягнік будзе перавозіць пасажыраў з Мінска ў Оршу і назад два разы ў дзень. Час адпраўлення са сталіцы ў 7.38 і 15.24, прыбыцця ў Оршу — у 9.56 і 17.42 адпаведна. З Оршы электрацягнік рэгіянальных ліній будзе адпраўляцца ў 10.10 і 18.46, прыбываць у Мінск — у 12.28 і 21.04.

Кошт праезду ў электрацягніках рэгіянальных ліній бізнэс-класа адпавядае кошту праезду ў агульных вагонах хуткіх цягнікоў, якія курсіруюць па аналагічных маршрутах. Ад Мінска да Оршы цана білета ў вышэйназваных цягніках складзе, такім чынам, 11 760 рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## 2 СТУДЗЕНЯ ВЫХАДНОГА НЕ БУДЗЕ

**2 студзеня беларусы будуць працаваць, выхаднога не будзе. Аб гэтым паведаміў карэспандэнту БЕЛТА намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль Тозік.**

«З 31 снежня на 1 студзеня сустрэнем Новы год, у нас ёсць магчымасць нармальна адпачыць, а 2-га — на работу», — сказаў Анатоль Тозік. Урад прапанаваў на ўвесь наступны год графік выхадных і святочных дзён, каб людзі маглі планаваць, дадаў віцэ-прэм'ер.

## ЭВАКУЯВАЛІ 68 ЧАЛАВЕК

**Увечары ў Лагойскі аддзел МНС ад жыхаркі пяціпавярховага трохпад'езднага дома ў мікрараёне Ваенны гарпасёлка Плешчаніцы паступіла паведамленне пра задымленне ў пад'ездзе №2.**

На месцы высветлілася, што ў корабе гарыць ізаляцыя электраправодкі. У выніку пажару яна была знішчана на першым і другім паверхах. Без электразабеспячэння засталіся 20 кватэр (45 жыльцоў). Работнікі МНС эвакуявалі па лесвічных маршах 68 чалавек, у тым ліку 21 дзіця. Пацярпелых, на шчасце, не было.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ІНСТЫТУТ КІТАЯЗНАЎСТВА БДУ — У СУСВЕТНАЙ ДВАЦЦАТЦЫ ЛЕПШЫХ

**Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па выніках работы ў 2011 годзе трапіў у дваццатку лепшых. Такая высокая ацэнка была дадзена на VI Сусветным форуме інстытутаў Канфуцыя, які прайшоў у Пекіне з 12 па 14 снежня.**

Форум быў прысвечаны падвядзенню вынікаў дзейнасці гэтых структур, а таксама абмеркаванню пытанняў, якія тычацца выкладання кітайскай мовы і папулярызацыі кітайскай культуры ў свеце. Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ прафесар Аляксандр Гардзей запэўніў, што іх дзейнасць і далей будзе накіравана на культурнае ўзаемаўзбагачэнне дзвюх краін, а таксама на стварэнне ў Беларусі цэнтраў кітайскай мовы і культуры.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ЗА ТЫДЗЕНЬ КАНФІСКАВАНА АМАЛЬ 60 КГ НАРКОТЫКАЎ І ПСІХАТРОПАЎ

**У выніку правядзення з 6 па 12 снежня на тэрыторыі краіны антынаркатычнай аперацыі «Канал-2011» з незаконнага абароту канфіскавана 58,6 кг наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, у тым ліку звыш 33 кг гашышу, звыш 15 кг — марыхуаны, каля 10 кг псіхатропаў.**

Праверaны звыш 15 тысяч транспартных сродкаў, у тым ліку 500 пасажырскіх цягнікоў. Выяўлена 97 злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў. 93 чалавекі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. Акрамя таго, з незаконнага абароту канфіскавана 69 адзінак агнястрэльнай зброі і 1160 боепрыпасаў. Кошт канфіскаваных матэрыяльных каштоўнасцяў і іншых прадметаў, забароненых да перавозкі, склаў каля 330 тысяч долараў. Так, на пероне чыгуначнага вакзала станцыі «Барысаў» пры выхадзе з цягніка «Санкт-Пецярбург — Брэст» быў затрыманы мужчына 1977 г.н., які меў пры сабе каля 44 г амфетаміну. А ў вёсцы Белыя Маладзечанскага раёна затрымалі грамадзяніна Расіі 1971 г.н., у якога знайшлі 622 г высушанай марыхуаны.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ДВА МІКРААЎТОБУСЫ СУТЫКНУЛІСЯ

**ДТЗ адбылося ля вёскі Званец у Рагачоўскім раёне. Як паведамілі ў прэс-службе ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама, раніцай аўтамабіль «Форд Транзіт» з украінскімі нумарамі нечакана выехаў на паласу сустрэчнага руху.**

Па ёй у гэты момант насустрач рухаўся аналагічны аўтамабіль, зарэгістраваны на жыхара Гомельскага раёна. 36-гадовага кіроўцу апошняга прыйшлося даставаць выратавальнікам пры дапамозе спецыяльнага інструмента. Цяпер ён знаходзіцца з сур'ёзнымі траўмамі ў рэанімацыі. Траўмы таксама атрымалі па адным пасажыры з абодвух мікрааўтобусаў. Большасць пасажыраў (8 грамадзян Украіны) толькі вельмі перапужаліся. Як, дарэчы, і 25-гадовы кіроўца ўкраінскага мікрааўтобуса. Па яго словах, ён заснуў за рулём.



Фота МНС.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**20 снежня 2011 года ў 14.00** адбудзецца пасяджэнне сёмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання, **21 снежня 2011 года ў 15.00** адбудзецца заключнае пасяджэнне сёмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання (зала пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4).

БЕЛАРУСБАНК

**Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» информирует, что с 19.12.2011 г. увеличены процентные ставки по срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях и установлены в следующих размерах:**

**«Накопительный» — 55% годовых** (как по вновь принимаемым, так и по ранее принятым вкладам, по которым не нарушена срочность).

**«Гарантированный доход»** на 15 дней — **47% годовых** (по вновь принимаемым, а по ранее принятым вкладам — с даты автоматического перезаключения на новый срок, начиная с 19.12.2011).

**Сберегательный сертификат** на 15 дней — **47% годовых**, на 2 месяца — **48% годовых**.

Информация о процентах, выплаченных по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам размещена на сайте www.belarusbank.by
Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

# «ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ УСТОЙЛІВЫ І НЕІНФЛЯЦЫЙНЫ РОСТ ЭКАНОМІКІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Задача для ўрада на 2012 год — замацаваць станоўчую тэндэнцыю, забяспечыць устойлівы і неінфляцыйны рост эканомікі. Паводле слоў Прэзідэнта, умовы для выканання гэтай задачы ёсць. З Расійскай Федэрацыяй вырашаны пытанні паставак газу, завяршаецца ўзгадненне схемы паставак нафты і нафтапрадуктаў, вызначаны механізмы работы Адзінай эканамічнай прасторы.

«Прагнозны рост ВУП у 2012 годзе на ўзроўні 105 працэнтаў збалансаваны з неабходнымі рэсурсамі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта адказ знешнім і ўнутраным крытыкам нашай эканамічнай палітыкі».

Пытанне імпартазамяшчэння было комплексна разгледжана на ўсіх узроўнях — ад аблвыканкама і канцэрнаў да НАН Беларусі і Савета Міністраў. Цяперашні семінар — гэта завяршаючы крок. Кожны яго ўдзельнік напрацаваў канкрэтныя рашэнні, якія, пачынаючы з сённяшняга дня, будуць рэалізоўвацца на практыцы.

На думку Прэзідэнта, для дасягнення агульнай мэты трэба вырашыць шэраг першачарговых задач. Першая з іх — паўсюдны і жорсткі рэжым эканоміі. Забяспечыць яго павінны ўрад, міністэрствы, канцэрны, вобласці, гар- і райвыканкамы. І гэтую задачу кіраўнік дзяржавы паставіў як палітычную.

Ураду сумесна са старшынямі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама даручана забяспечыць зніжэнне імпартаёмістасці вытворчасці штогод на 1-2 працэнтныя пункты.

Што датычыцца эканоміі сыравіны і рэсурсаў, то над гэтым павінны працаваць абсалютна ўсе. Кожны ўдзельнік семінара — у зоне сваёй адказнасці.

Працэс зніжэння энергаёмістасці неабходна стымуляваць усімі даступнымі метадамі, лічыць Аляксандр Лукашэнка. Для арганізацый, якія нерацыянальна выкарыстоўваюць энергарэсурсы, узнімаць іх кошт. Уводзіць ліміты спажывання прыроднага газу і электраэнергіі.

«Не ўклаўся — плаці ў разы больш, — сказаў Прэзідэнт. — І не за кошт дзяржаўнага прадпрыемства! Адказваць павінны канкрэтныя асобы».

Для тых работнікаў, што эканомяць, неабходна прадугледзець прэміяванне на рэгулярнай аснове.

Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу ў бліжэйшы час не менш за чвэрць аб'ёму электрычнай і цеплавой энергіі выпрацоўваць за кошт выкарыстання мясцовых відаў паліва, другасных энергетычных рэсурсаў і альтэрнатыўных крыніц энергіі.

«За пяцігодку неабходна знізіць энергаёмістасць ВУП на трэць, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Тым самым вы вырашым задачу Дырэктывы №3 аб зніжэнні энергаёмістасці ВУП у 2015 годзе не менш чым на 50 % да ўзроўню 2005 года».

Аналагічная работа павінна быць праведзена Саветам Міністраў і мясцовымі органамі ўлады па аптымізацыі матэрыялаёмістасці. Гэта прамы рэзерв росту ВУП.

Кіраўнік дзяржавы даручыў на працягу 2012 года правесці інвентарызацыю ўсіх вытворчасцяў і прадпрыемстваў. Лідарам, якія забяспечваюць станоўчае сальда і рэнтабельнасць, не трэба перашкаджаць. Па адстаючых прадпрыемствах трэба выпрацаваць эфектыўныя меры.

«Мае патрабаванні ўсім вядомыя: эфектыўнасць арганізацыі вымяраецца колькасцю прыбытку на рахунку і заработнай платай работнікаў», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт перакананы, што толькі буйныя, добра аснашчаныя прадпрыемствы здольныя выстаяць у канкурэнтнай барацьбе і пры гэтым забяспечыць дынамічнае эканамічнае развіццё.

«Мы не пагадзіліся з заходнімі кансультантамі, якія рэкамендавалі раздрабіць нашы прамысловыя і сельскагаспадарчыя аб'яднанні, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта быў шлях да краху. Сёння нашы МАЗ, МТЗ, Атлант, Гомсельмаш, БМЗ, БелАЗ і іншыя, па сутнасці, з'яўляюцца вядучымі прадпрыемствамі еўрапейскага ўзроўню.

Мінэканомікі вызначыла кропку знешнеэканамічнай раўнавагі. Не менш чым 65% прамысловай вытворчасці павінна быць прададзена за мяжу. Такую задачу кіраўнік дзяржавы паставіў перад усёй вертыкаллю ўлады і кіраўніцтвам дзяржпрадпрыемстваў. На яго думку, для дасягнення гэтай мэты трэба развіваць вытворчасці, якія маюць высокую долю мясцовых рэсурсаў, а таксама больш глыбокую іх перапрацоўку.

«Мяркуйце самі, у краіну значнымі аб'ёмамі завозяцца тавары, для вытворчасці якіх у нас ёсць усе сыравінныя рэсурсы — малако, мяса, гародніна, шкло, драўніна і хімічная прадукцыя, — адзначыў Прэзідэнт. — Мы, у сваю чаргу, экспартуем гэтыя ж сыравінныя рэсурсы без належнай ступені перапрацоўкі. І асноўную частку дабаўленага кошту, а значыць, і прыбытку, атрымліваем не мы, а замежныя кампаніі».

Кіраўнік дзяржавы даў даручэнне ўраду і НАН Беларусі выпрацаваць больш жорсткія нормы расходавання сыравіны і матэрыялаў. Большая частка з іх імпартныя ці мае імпартныя складнікі. Напрыклад, за 10 гадоў у будаўніцтве пры росце аб'ёму работ у 3 разы спажыванне металу вырасла ў 7 разоў... «Як гэта разумець?» — задаў пытанне Прэзідэнт.

Гаворачы аб імпартазамяшчэнні на спажывецкім рынку, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што тут доля імпарту складае больш за 17 працэнтаў. Гэта дзіцячае харчаванне, цукеркі, чыпсы, шакалад, бульба, капуста, яблыкі...

«Але ўсё гэты мы ў стане вырабіць і вырасціць самі!» — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы даручыў распрацаваць дзейсную сістэму стымулявання працы і заахвочвання на ўсіх узроўнях, якая будзе залежыць ад вынікаў экспарту і імпартазамяшчэння.

Завяршаючы пленарнае пасяджэнне, Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду распрацаваць канкрэтныя задачы кожнаму з міністэрстваў і ведамстваў, зыходзячы з прынятых на семінары рашэнняў.

«Жыццё мяняецца, другая хваля сусветнага крызісу насоўваецца. У сувязі з гэтым неабходная іншая тактыка, канкрэтызацыя задач», — сказаў Прэзідэнт.

**Сяргей ПРОТАС.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «Ужо ў першай палове 2012 года беларусы забудуць аб праблемах у фінансава-эканамічнай сферы»

Аб гэтым ён заявіў у інтэрв'ю радыёстанцыі «Руская служба навін», паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

«Мы цяпер, выходзячы з гэтага фінансавага дысбалансу (гэта нават не крызіс, гэта разбалансавалася фінансавая сістэма, і дэвальвацыя рубля да гэтага прывяла), падцягваемся. І я ўпэўнены, што ў будучым годзе мы аб гэтым забудзем, нават у першым паўгоддзі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі абвінавачвае Захад у стварэнні пояса нестабільнасці на Блізкім Усходзе і поўначы Афрыкі.

«Ну, разбамбілі Лівію. Далей што? Было 15 або 10 тысяч пераносных зенітна-ракетных комплексаў. Колькі засталося на складах? Іх расцягнулі ўсе. А што заўтра будзе? — адзначыў Прэзідэнт. — Гэта ж дасталася, зразумела, тэрарыстам, якія сёння дзейнічаюць ад Расіі, Каўказа і далей па ўсёй дузе. А што такое ПЗРК, вы ведаеце. Я добра ведаю, што такое ПЗРК — на плячо, пры прызямленні самалёта з 3 км — самалёта няма. Каму мы аддалі зброю?»

«Яны (Захад. — **Заўвага БЕЛТА**) там бяздумна, без усякіх на тое падстаў стварылі не проста Лівію, а там жа цэлы пояс: у Егіпце ісламісты перамаглі. А што, у Тунісе лепшая сітуацыя? Квітнеючая была краіна. Яны ж стварылі як прыклад, дапамагалі Тунісу. Тое ж самае», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што не варта імкнуцца да змены ўлады ў блізкаўсходніх і афрыканскіх краінах, калі той лідар, які знаходзіцца на чале дзяржавы цяпер, з'яўляецца меншым злом, чым тое, якое можа быць.

«А гэта лёгка было пралічыць. І расіяне гвалтам крычалі, і мы аб гэтым гаварылі, што будзе ісламізацыя. Гэта ж можна было пралічыць! Я не кажу аб яўрэях, там спецслужбы даўно зразумелі, што будзе, і яны першыя сказалі: «Не чапайце Егіпет. Так, нам з імі цяжка, але будзе горш». Цяпер гавораць: «Не чапайце Асада. Так, мы з ім увесь час у напружанні, але гэты чалавек зберагае нас ад вайны з Сірыяй». А амерыканцы гэтага не паслухалі», — адзначыў Прэзідэнт.

«Яны (Захад. — **Заўвага БЕЛТА**) гэтага не разумеюць. Гэта я ведаю дакладна. Дык навошта нам сёння скідваць гэтага архаічнага чалавека, лідара, дзеля таго, каб зрабіць яшчэ горш? — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што паляпшэнне беларуска-расійскіх адносін пойдзе на карысць супрацоўніцтву з Кітаем.

«Запомніце адзін нюанс: Кітай ніколі не будзе мець справу ні з прыбалтыйскімі дзяржавамі, ні з Украінай, ні з Беларуссю, для прыкладу кажу, ні з Польшчай, калі ў нашых дзяржаў будуць канфлікты, тым больш з Расіяй. Ніколі! Яны будуць развіваць адносіны, але да нейкага ўзроўню. Гэта мы добра ведаем», — адзначыў Прэзідэнт.

«Кітайцы — вельмі акуратныя, разумнікі, старажытная нацыя, яны вельмі тонка выбудоўваюць сваю палітыку, яны не хочуць сварыцца нават з Амерыкай з-за Расіі ці яшчэ з-за каго-небудзь. Па-першае, напэўна, іх час не прыйшоў яшчэ. Яны выразна разумеюць, што ёсць у свеце адна імперыя. Адна. Гэта я дакладна ведаю. Яны хочуць шматпалярнага свету, але яны добра разумеюць, што ён цяпер аднапалярны, — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Таму, на думку Аляксандра Лукашэнкі, паляпшэнне да максімуму, як цяпер, адносін Беларусі з Расіяй, для Кітая карысць. «Гэта аксіёма на сённяшні дзень», — сказаў ён.

«Таму нашы добрыя адносіны з Расіяй толькі паляпшаюць нашы адносіны з Кітайскай Народнай Рэспублікай», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка лічыць недапушчальным думаць, што тэракт у мінскім метро — «заказ улады».

Прэзідэнт Беларусі расказаў, што прыме рашэнне аб тым, паміліваць ці не прыгавораных да пакарання смерцю за тэракт у мінскім метро Дзмітрыя Канавалава і Уладзіслава Кавалёва пасля таго, як яму прадставяць неабходныя дакументы. Пакуль такія дакументы кіраўніку дзяржавы не паступалі.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што спачатку ўсе дакументы праходзяць праз спецыяльную камісію па памілаванні пры Прэзідэнце.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што думае аб гэтым кожны дзень. Паводле яго слоў, для яго «самая страшная функцыя — гэта калі ты падпісваеш указ, дзе чалавека нельга паміліваць». «Асабліва ў Беларусі, таму што ў нас ёсць пажыццёвае зняволенне і выключная мера пакарання. І калі ёсць хоць найменшае сумненне, хоць крыху... Хоць пажыццёвае зняволенне, як многія кажуць, гэта больш страшна, чым пакаранне смерцю, таму што чалавек у клетцы сядзіць, груба кажучы. Але, тым не менш, раптам ты памыліўся і ўзяў на сябе?!» — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У той жа час Прэзідэнт лічыць недапушчальным, што нехта разыгрывае гэту сітуацыю ў палітычных мэтах. «Я перажываю за тое, што ёсць людзі, якія пачынаюць разыгрываць гэта зноў жа ў палітычных мэтах: «а-а, дык гэта там заказ улады», яшчэ нечага і гэтак далей. Я чалавек біты ўжо, я ўсё гэта разумею, але ніяк не магу да гэтага часу змірыцца, калі пачынаюць абвінавачваць ва ўсіх грахах», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Вось я думаю: добра, але калі здзелка (вы — улада, я — злачынец), калі ёсць здзелка, дык я ж вам нешта павінен паабяцаць. Ну калі чалавеку пакаранне смерцю даюць, за што ж ён будзе адмазваць, груба кажучы, гэту ўладу?! — сказаў Прэзідэнт. — Па-другое, я ўсё роўна шукаю варыянты, каб выкрыць гэтых нягоднікаў, якія сёння спрабуюць так заяўляць. Ну а па-трэцяе, уявіце: для чаго ўладзе гэта трэба было? Заўсёды ж матывацыя павінна быць. «А каб там адвесці грамадскую думку». Ад чаго? Дык што, для таго каб выратаваць, дапусцім, ложак, трэба было спаліць увесь дом?»

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што кантраляваў ход расследавання «кожны дзень, кожную гадзіну следства». Прэзідэнт падкрэсліў, што для яго было галоўным, каб следства адпрацавала ўсе версіі. «Калі мне далажылі аб тым, што знойдзены гэтыя людзі, я дзесяць разоў перачытаў гэтае паведамленне, адклаў убок: «Добра, затрымалі». А ў нас жа былі і іншыя версіі. Я кажу: «Адпрацоўвайце іншыя версіі. А раптам гэта не так?» Таму следчыя, група ўзялася за гэту асноўную версію, пачала іх дапытваць. Але я дабіваўся ў следства, каб яны іншыя версіі разглядалі. Ну а раптам... Таму што гэта неверагодна для Беларусі было», — сказаў ён.

«І вось усюды мне ўвесь час дакладвалі адно: «Я хацеў дэстабілізаваць абстаноўку», — ён гаворыць. Другі, той адразу павіс, таму што разумеў, куды ўкляпаўся. Так, напэўна, абодва разумелі і да гэтага. Але той яшчэ на нешта, відаць, спадзяваўся, а гэты для сябе адразу вырашыў, што яго ніхто не пашкадуе, што будзе першым чалавекам у Беларусі, які гэта зрабіў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Прычым тут улада?» — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што не рыхтуе сабе пераемніка, а новы лідар з'явіцца тады, калі гэтага запатрабуе сітуацыя ў краіне.

Гаворачы аб магчымай падрыхтоўцы пераемніка, Прэзідэнт сказаў: «Я страшна не разумею гэтага, і гэта выключана. Мяне шмат папракаюць: вось, сыны і іншае. Паверце: больш за ўсё не хачу, каб мой сын быў пасля мяне Прэзідэнтам». «Гледзячы на мяне, мае дзеці ўжо наеліся прэзідэнцтва», — дадаў ён.

Адказваючы на пытанне, калі ў Беларусі з'явіцца «нумар 2 пасля Лукашэнкі», кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэта адбудзецца само, калі сітуацыя запатрабуе новага лідара.

«Як толькі ўзнікне такая прычына, калі народ ужо нецярпімы да цябе — усё: і нумар два, і нумар тры, і нумар пяць з'явіцца. Нават тыя, каго цяпер не відаць!» — сказаў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што ў 1994 годзе, калі прыйшоў да ўлады, быў адным з многіх. «Мяне ж не бачыў ніхто тады. Чаму людзі так за мяне прагаласавалі?! Не толькі таму, што я правільныя рэчы гаварыў, таму што сітуацыя наспела. Калі б не было гэтай сітуацыі, я б ніколі Прэзідэнтам не быў», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым ён дадаў: «Я ніколі не цешу сябе надзеяй, што я нумар адзін. Я нумар адзін, таму што я Прэзідэнт, у мяне вялікія паўнамоцтвы, больш за ўсіх мяне бачаць».

Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, якім да яго будзе стаўленне ў Беларусі праз гады, калі ён пакіне прэзідэнцкую пасаду. «Як бы мне страшна ні было, я нават гатовы, што ў акно палкамі будуць кідаць, нават пры жыцці. Я да гэтага гатовы. Таму што я разумею, што сітуацыя можа быць. Мне б вельмі гэтага не хацелася, але яна можа быць такой», — сказаў ён.

У той жа час Прэзідэнт лічыць, што былы лідар краіны можа адчуваць сябе спакойна ў Беларусі і без боязі хадзіць па горадзе.

Парламенцкі дзённік

# НАЙСТРАЖЭЙШАЯ ЭКАНОМІЯ

## Дэпутаты прынялі ў першым чытанні праект бюджэту на будучы год

**Вестка пра зацягнутыя паясы сама па сабе не новая: таго вымагае наяўная сітуацыя, якую мы ўсе бачым самі. Якія задачы плануюць вырашыць айчынныя фінансісты налета? Давядзецца істотна знізіць тэмпы інфляцыі: прырост цэн не павінен перасягнуць 22% , запэўнівае міністр фінансаў Беларусі Андрэй ХАРКАВЕЦ. Трэба будзе максімальна поўна задзейнічаць патэнцыял эканамічнага росту, значна больш эфектыўна выкарыстоўваць дзяржаўную маёмасць і забяспечваць знешнюю збалансаванасць. Адмоўнае сальда знешняга гандлю, паводле прагнозу, налета складзе 3,2 млрд долараў ЗША. Асноўную стаўку ў фінансаванні гэтай пазіцыі спецыялісты робяць на прыток інвестыцый, бо «продаж маёмасці не можа і не павінен служыць крыніцай пакрыцця». Як ні круці, трэба выходзіць на станоўчае сальда. Дасягнуць яго можна толькі праз рост экспарту і замаруджванне імпартаспажывання. Налета будзе праводзіцца жорсткая грашова-крэдытная палітыка, акцэнтаваў міністр. Рост ВУП запланаваны на ўзроўні 5,5%, сярэднегадавы курс долара, які браўся ў разлік, — 9150 рублёў.**

Праект бюджэту на 2012 год, падтрыманы дэпутатамі ў першым чытанні, прадугледжвае традыцыйную структуру прыбыткаў. Ключавы ўнёсак, як заўжды, зробяць ПДВ, даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці, падаходны падатак, падатак на прыбытак, акцызы, падаткі на ўласнасць. На іх разлічваюць «зарабіць» больш як 141,8 трлн рублёў (столькі складуць прыбыткі кансалідаванага бюджэту).

Бюджэт запланаваны без дэфіцыту, гэта значыць, патрацiць плануюць роўна столькі ж, колькі і зарабіць. Выдаткі фарміраваліся ў рэжыме «найстражэйшай эканоміі», падкрэсліў А. Харкавец. Такі падыход прадугледжвае скарачэнне неперашачарговых выдаткаў. Сярод асаблівасцяў бюджэту міністр згадаў значнае павелічэнне расходаў па пагашэнні і абслугоўванні дзяржаўнай і мясцовых пазык, скіраванне ў рэзервовы фонд дадатковых паступленняў, рост рэальнага заробку ў бюджэтнай сферы не менш чым на 5%. Мінфін увогуле імкнецца «зблізіць узровень аплаты працы ў бюджэтным сектары з узроўнем у цэлым па ўсёй эканоміцы». Прыярытэтнымі для фінансавання вызначаныя ахова здароўя, адукацыя, навука, паведаміў міністр. Сацыяльная скіраванасць бюджэту, такім чынам, захоўваецца. Значную частку ў ім складуць выдаткі на аплату працы, пенсіі, стыпендыі, іншыя выплаты, сродкі на выкананне дзяржаўных сацыяльных стандартаў. У цэлым фінансісты будуць імкнуцца павысіць устойлівасць і канкурэнтаздольнасць нацыянальнай эканомікі, выканаць фінансавыя абавязкі бюджэту перад знешнімі і ўнутранымі крэдыторамі, захаваць якасць бюджэтных паслуг і забяспечыць сацыяльную абарону найбольш уразлівых катэгорый насельніцтва.

Дэпутаты падчас абмеркавання ў большасці сваёй пагаджаліся, што звярстаны праект аптымальна размяркоўвае сродкі, пытанні ў іх выклікалі хіба што нюансы фінансавання чарнобыльскіх праграм і сістэмы аховы здароўя.

— Фінансаванне такіх галін, як адукацыя і ахова здароўя ідзе наперадзе інфляцыі, — акцэнтаваў у гутарцы з журналістамі **Аляксандр АНТОНЕНКА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце, фінансах і падатковай палітыцы**. — Нельга сказаць, што мы ўкладзём вялікія дадатковыя грошы ў гэтыя сферы, тым не менш, іх фінансаванне ідзе апераджальнымі тэмпамі. Закладзены эфект развіцця.

Асаблівасцю разгледжанага праекта бюджэту парламентарый назваў стварэнне рэзерву на ўзроўні краіны і на ўзроўні абласцей — усяго 2,6 трлн рублёў. Гэтыя сродкі, паводле яго меркавання, таксама, пойдуць на тыя ж мэты, што прадугледжаны ў бюджэце. «Відаць нельга назваць іх падушкай бяспекі, як у Расіі, але тым не менш, пэўны момант у гэтым ёсць. Я думаю, што пры нармальнай рабоце прамысловасці і эканомікі краіны гэтыя грошы пойдуць на тыя ж кірункі, і ў першую чаргу на вырашэнне тых сацыяльных праблем, якія будуць у нас узнікаць у 2012 годзе», мяркуе дэпутат.

Дэпутаты таксама прынялі ў двух чытаннях праект бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Беларусі на 2012 год і папраўкі ў Падатковы кодэкс у першым чытанні. Асаблівую ўвагу варта звярнуць на «радыкальнае зніжэнне стаўкі падатку на прыбытак з 24 да 18 адсоткаў». У выніку яна стане самай нізкай у Мытным саюзе, акцэнтуе міністр фінансаў (у Расіі і Казахстане стаўка падатку на прыбытак складае 20%). А значыць, аўтаматычна павышае канкурэнтаздольнасць айчыннага экспарту ў гэтым інтэграцыйным утварэнні. Зніжаны памер падатковай стаўкі робіць яе прывабнай нават у параўнанні з некаторымі заходнімі краінамі. Айчынныя фінансісты разлічваюць, што такі расклад «станоўча паўплывае на рашэнне інвестара аб вядзенні бізнэсу ў Беларусі». Агульнае зніжэнне падатковай нагрузкі на эканоміку павінна скласці 0,4% да ВУП. У цэлым распрацаваныя захады павінны забяспечыць спрашчэнне падатковай сістэмы, умацненне інвестыцыйных стымулаў і павышэнне канкурэнтаздольнасці эканомікі. Яны таксама «ўзгадняюцца з работай па лібералізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці», падкрэсліў міністр.

У другім чытанні праект галоўнага фінансавага дакумента года будзе разгледжаны, верагодна, ужо ў панядзелак.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## У ПІНСКУ ПАЧАЎСЯ СУДОВЫ ПРАЦЭС ПА КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЕ АБ ВЫБУХУ НА «ПІНСКДРЭВЕ»

**Нагадаем, што трагедыя на пінскім прадпрыемстве адбылася 25 кастрычніка 2010 года. Ад выбуху быў практычна разбураны цэх па вытворчасці драўнянастружкавых пліт. У першыя секунды загінулі два чалавекі, яшчэ 12 памерлі ў бальніцах. Усяго ў выніку аварыі пацярпеў 21 чалавек.**

На лаве падсудных тры чалавекі: галоўны інжынер холдынгавай кампаніі «Пінскдрэў» Уладзімір Шастакоў, дырэктар прадпрыемства «Пінскдрэў ДСП» Леанід Логвін і галоўны інжынер гэтага прадпрыемства Ігар Логвін.

Былога гендырэктара холдынгавай кампаніі Ларана Арыніча на судзе няма. Пасля таго, як Генеральная пракуратура паведаміла яму аб завядзенні ў дачыненні да яго крымінальнай справы, Ларан Арыніч адбыў за мяжу на лячэнне і больш не вярнуўся ў Беларусь. Цяпер ён аб'яўлены ў вышук. Пацярпелыя і сваякі загінулых накіравалі пісьмы ў вышэйшыя праваахоўныя структуры і дзяржорганы з патрабаваннем паскорыць вышук былога генеральнага дырэктара.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## У ЕЎРОПУ — ТОЛЬКІ З ПРЫШЧЭПКАЙ СУПРАЦЬ АДРУ

**Эпідэмічная сітуацыя з захваральнасцю на адзёр на еўрапейскім кантыненце сур'ёзна ўскладнілася.**

Па звестках Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у 36 еўрапейскіх краінах сёлета са студзеня па кастрычнік было зарэгістравана 26 тысяч захварэлых на адзёр. 9 чалавек загінулі ў выніку хваробы. Самая напружаная эпідэміялагічная сітуацыя склалася ў Францыі, дзе колькасць захварэлых дасягнула 14 тысяч, а колькасць памерлых склала 6 чалавек. Сёлетняя ўспышка адру ў Заходняй Еўропе — адна з самых буйных на планеце. Спецыялісты ўстанавілі сувязь адру еўрапейскага паходжання з успышкамі ў некаторых іншых краінах, уключаючы Бразілію, Канаду і Аўстралію. Адзёр з еўрапейскага рэгіёна і Паўднёва-Усходняй Азіі трапіў у ЗША, дзе таксама зарэгістравана самая вялікая колькасць захварэлых, пачынаючы з 1996 года.

90 працэнтаў захварэлых на адзёр у Еўропе — гэта падлеткі і дарослыя, якія або не праходзілі вакцынацыю, або ў адносінах да якіх звесткі аб вакцынацыі адсутнічаюць. У Расійскай Федэрацыі зараз паказчык захваральнасці на адзёр вырас у 1,6 раза ў параўнанні з папярэднім годам. Па звестках Міністэрства аховы здароўя Украіны, захваральнасць на адзёр вырасла ў краіне ў 6 разоў у параўнанні з 2010 годам: за 10 месяцаў былі зарэгістраваны 193 выпадкі адру. Прычым у лістападзе і снежні працягваўся рост захваральнасці ў заходніх рэгіёнах краіны. Так, з 1 па 13 снежня ў Львоўскай вобласці было зарэгістравана 249 захварэлых з падазрэннем на адзёр, у Івана-Франкоўскай вобласці — 85 і ў Ровенскай — 9 такіх выпадкаў. Неспрыяльная сітуацыя па адры ва Украіне звязана як з пагаршэннем эпідэмічнай сітуацыі ў еўрапейскіх краінах, так і з масавымі адказамі ад вакцынацыі ў апошнія гады.

Спецыялісты нагадваюць, што адзёр распаўсюджваецца паветрана-кропельным шляхам: вірус выдзяляецца ў знешняе асяроддзе ў вялікай колькасці хворым чалавекам падчас кашлю або чхання. Таму моцна рызыкуюць падчас замежных паездак беларусы, якія не маюць імунітэту да гэтай інфекцыі. Міністэрства аховы здароўя рэкамендуе ўсім, хто плануе паездку ў еўрапейскі рэгіён, у тым ліку ва Украіну і Расійскую Федэрацыю, яшчэ да паездкі паклапаціцца пра двухразовую імунізацыю.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:

# «Неабходна актыўна прыцягваць у Беларусь буйныя еўрапейскія канцэрны для таго, каб ствараць тут сумесныя прадпрыемствы»

**Падчас пастаянна дзеючага семінара кіруючых работнікаў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч наведаў у Заслаўі прадпрыемствы, якія годна спраўляюцца з задачай імпартазамяшчэння. Гэта СТАА «Хенкель Баутэхнік» і паркетная фабрыка «Косвік». Пасля экскурсіі па вытворчасцях кіраўнік урада падзяліўся ўражаннямі з журналістамі.**

— Мы паглядзелі паспяховыя прадпрыемствы. На жаль, не ўсе такія, — зазначыў ён. — І не ўсе дастаткова працуюць над імпартазамяшчэннем. Мэта семінара ў тым і заключаецца, каб на добрых прыкладах паказаць, як трэба працаваць. Тут прысутнічаюць і міністры, і кіраўнікі раёнаў, абласцей. Убачанае павінна добра «разагрэць» кадры для таго, каб яны на месцах ажыццяўлялі аналагічныя праекты.

Аднак імпартны складнік у вытворчасці прадукцыі вышэйназваных прадпрыемстваў даволі высокі: 50 працэнтаў па будаўнічых сумесях («Хенкель Баутэхнік») і да 15-20 працэнтаў пры вытворчасці паркету («Косвік»). «Таму тут вельмі вялікі, як кажуць, фронт працы, — разважае прэм'ер. — І ў першую чаргу для нашай хімічнай прамысловасці, бо асноўны імпарт на гэтым прыкладзе — высакаякасная хімія». Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што гэта не значыць, што мы павінны стварыць самастойна хімічныя заводы. Больш выгадна для нас і перспектыўна — супрацоўніцтва з ужо добра вядомымі замежнымі кампаніямі. «Як кажуць у краінах Паўднёва-Усходняй Азіі, трэба зрабіць «скок» — сюды неабходна актыўна прыцягваць буйныя еўрапейскія канцэрны для таго, каб ствараць сумесныя прадпрыемствы. Гэта і ў нашых інтарэсах, і ў інтарэсах заходніх партнёраў», — лічыць кіраўнік урада.

Таксама Міхаіл Мясніковіч засяродзіў увагу на тым, што нельга разбіваць краіну на кавалкі па абласцях пры падліку інтэнсіўнасці і эфектыўнасці імпартазамяшчэння. Напрыклад, Мінская вобласць па гэтых паказчыках выглядае добра. «Але гэта не праз тое, што шмат зрабілі, — папярэджвае прэм'ер-міністр, — а таму што структура валавога рэгіянальнага прадукту менавіта такая: вы робіце БелАЗы, вырабляеце вельмі шмат калійных угнаенняў, якія ідуць у залік Мінскай вобласці. І натуральна, што імпартны складнік у прамысловасці значна меншы, чым у іншых рэгіёнах. Але мы не федэральная дзяржава, а ўнітарная. Таму павінны лічыць па краіне». Значыць, кожны павінен зрабіць свой уклад у агульную справу. Так, як гэта ўжо некаторыя робяць. **Сяргей НАВІЦКІ, генеральны дырэктар кампаніі «Хенкель Баутэхнік»** у Беларусі, расказаў, чаму яго прадпрыемства квітнее: «Сакрэт поспеху ў тым, што мы напружана працуем і выпускаем канкурэнтаздольную прадукцыю». Сапраўды, вырабы гэтага завода маюць значна меншую цану, чым, напрыклад, расійскія аналагі, але па якасці нават перавышаюць іх узровень.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

*Мінскі раён.*

# ПА «ХЭНДМЭЙД» — НА «МЛЫН»!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Выразаць з цэльнага дрэва кампазіцыю давялося амаль цэлы год, можна сказаць, без выхадных. «Практычна на ложку», — усміхаецца жонка: вялікая сям'я жыве ў прыватным доме.

— А ўжо калі я самастойна варыў, выгінаў з таўшчэзнай арматуры ногі для буслоў, ведаеце, прыгадаў у думках усе «выгінальныя» словы, — такім жа чынам адгукаецца майстар. — Цяжкай праца аказалася!

Апроч іншых работ Віктара Іванавіча, уражвае скульптура з чырвонай вольхі «Полымя Хатыні». У ёй — жах, агонь... Работу заказаў гадоў 20 таму музей, ды так і не забраў. Метровую выяву Хрыста з дуба мы змаглі пабачыць толькі на фотаздымку: выкананая па замове разам з разным крыжом, яна з'ехала ў Італію, у адзін з касцёлаў.

Рамеснік Леанід Захаравіч Баркоўскі з пасёлка Самахвалавічы Мінскага раёна дваццаць гадоў займаецца ландшафтнымі кампазіцыямі на зрэзе бярозы — уласным ноу-хау. Акрамя дрэва і драўніннага грыба, выкарыстоўвае для іх і іншы прыродны матэрыял: асобныя суквецці лекавых траў, саломку, мох, гліну. Тэма кампазіцый — сучасны побыт вёскі, абавязкова — з прыроднымі сімваламі: бусламі, совамі і, вядома ж, бярозай.

— Можа, іншы раз і ўзнікне думка, што надакучыла такі доўгі час займацца гэтай справай, але свядомасць — вышэйшая ступень успрыняцця — кажа: «хто, калі не ты?» — трохі пафіласофстваваў майстар. — Гэта ж і мой лад жыцця, і маё задавальненне, і мае грошы.

Каб зарабіць апошнія, свае творы Леанід Захаравіч рэалізуе ў Піцеры. А за дзяржаву, як той казаў, яму крыўдна.

— Я і з міністрам культуры размаўляў на гэтую тэму, і Прэзідэнту хачу напісаць... У Мінску няма нармальнага месца, дзе можна было б выстаўляць працы майстрам. Я не пра галерэі кажу, а пра вуліцу. Вось прыкладна тым жа калектывам, што і зараз на гэтай выставе, толькі на бачным месцы. Памятаеце, як было колісь на праспекце ў цэнтры сталіцы? Няхай бы такое месца працавала хоць бы і па выхадных, але каб там не «мадэ ін Кітай» выстаўляўся, і не «купі-прадай» стаялі, а майстры самі прадавалі ўласныя творы. Як гэта робіцца ва ўсім свеце: у цэнтры горада, на турыстычных маршрутах. Каб маглі бачыць свае вытокі. Няхай бы і калектыў, які з вёскі прыехаў, паспяваў бы тут жа. Такія выставы — гэта ж твар дзяржавы! Што могуць пабачыць зараз замежныя турысты, гуляючы па Мінску? Яны ж не плітку тратуарную едуць сюды пабачыць.

...Мінчанка Яна Каўгарэня — псіхолаг па прафесіі. А, як рамеснік, вырабляе свечкі з натуральнага пчалінага воску. Водар ад іх — не перадаць словамі!



— У нас свая пасека ў Мінскай вобласці. Колькі вулляў? Дастаткова. У пчалаводаў не заведзена адказваць на такія пытанні, — усміхаецца Яна. А пра свой занятак распавядае з задавальненнем.

Расказала, што муж пчоламі займаецца ўжо даўно, сама ж яна далучылася да гэтай справы адносна нядаўна — як пабраліся шлюбам. Сужэнец і зараз больш глядзіць пчол, яна ж — не прападаць жа такой каштоўнай сыравіне — занялася вырабам свечак. Парафінавыя, як высветлілася, могуць уплываць на здароўе, а ад натуральных з пчалінага воску — адна карысць. Нават такое паняцце, як водаратэрапія, ёсць.

Для вырабу свечак патрэбны спецыяльны посуд і формачкі ў выглядзе елачак, драконаў, шышак, анёлачкаў і іншыя. Дарэчы, Яна кажа, што нейкіх любімых формаў у яе няма, падабаюцца літаральна ўсе. Праца — ручная: і форму сабраць, і кнот уставіць. Працэс не тое каб вельмі цяжкі, але працяглы па часе: за дзень, на прыклад, можна вырабіць толькі дзве свечкі. А прадае іх рамесніца на кірмашы па цане ад 7 да 95 тысяч.

Экарух, які нарадзіўся ў краінах Еўропы, набывае ўсё больш паслядоўнікаў і ў нас. Гэта калі людзі аддаюць перавагу натуральнаму: у ежы, у адзенні. І калі гаварыць пра апошняе, менавіта авечая шэрсць валодае шэрагам унікальных уласцівасцяў. Напрыклад, валены абутак з цягам часу, у працэсе ноські, робіцца толькі мацней. З пункту погляду майстра, яна — такая сыравіна — нашмат больш пластычная, чым тая ж кераміка. З шэрсці можна вырабляць не толькі адзенне і абутак, але і галаўныя ўборы, і цацкі, упрыгажэнні...

— Гэты від творчасці зараз — на самым піку, — пацвярджае член Саюзаў мастакоў, дызайнераў, міжнароднага аб'яднання аўтарскіх лялек Вольга Ахмерава. — Ахвотных навучыцца валяць з шэрсці цалкам утылітарныя і ў той жа час адмысловыя рэчы настолькі шмат, што мы не ведаем, як усіх «уціснуць» у групы.



Трэба сказаць, што такое хобі танным не назавеш. Для вырабаў розных рэчаў выкарыстоўваецца ўжо гатовая для працы авечая шэрсць нямецкай вытворчасці (нават пафарбаваная адразу ў розныя колеры), што ўжо накладае свой адбітак на «цану пытання». З іншага боку, выкарыстанне гатовай шэрсці робіць занятак з ёй цалкам бяспечным. Адзінае — патрэбна фізічная сіла.

— Даўней вырабамі з шэрсці па гэтай прычыне займаліся выключна мужчыны, — гаворыць Вольга Ахмерава. — Колькі патрэбна часу на тую ці іншую рэч? Па-рознаму. І памер яе ўплывае, і натхненне: бывае, нешта драбнейшае па памерах вырабляеш даўжэй, чым якую буйную рэч. На валёнкі, скажам, ідзе ад трох тыдняў, а на невялікае ўпрыгажэнне патрэбна гадзіны са тры.

Апошнія, а таксама невялікія цацкі з авечай шэрсці можна набыць 70 да 100 тысяч рублёў. Колькі каштуюць іншыя прадметы з прадстаўленых? Суразмоўца дыпламатычна адказала, што, акрамя кошту сыравіны, трэба яшчэ ўлічваць і цаніць уласную працу. Што ж, цалкам рэзонна: калі ты не будзеш сам цаніць тое, што робіш, чаму гэта павінны рабіць іншыя? А з іншага боку... Улічваючы плацежаздольнасць беларусаў апошнім часам, наша размова ў чарговы раз перайшла ў плоскасць абмеркавання расійскага рынку...

...Хто пажадае набыць адмысловы падарунак да калядных і навагодніх свят, зроблены з натуральных матэрыялаў і рукамі сапраўдных майстроў, зможа зрабіць гэта цягам выхадных. Менавіта такі рэжым працы ў зімовага «Млына». Схадзіць на выставу можна і проста як на экскурсію — сумна не будзе. Уваход, дарэчы, свабодны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

Ёсць нагода? Ёсць пытанне!

## АМЕРЫКАНЦЫ — ПРАГМАТЫЧНЫЯ, А БЕЛАРУСЫ — «ПРЫШПІЛЬНЫЯ» І ЛЮБЯЦЬ ДРАНІКІ

**У ЗША выбралі слова года. Лінгвісты адзначылі, што сёлета найбольшая колькасць запытаў у анлайн-версіі слоўніка Мэрыяма-Вэбстэра датычылася паняцця «pragmatic» (прагматычны). Як лічаць выдаўцы слоўніка, павышаная цікаўнасць да «pragmatic» можа быць выклікана тым, што слова адлюстроўвае перавагу прагматычнасці над легкадумнасцю ў настроі амерыканцаў, паведамляе Associated Press.**

### А ЯКОЕ БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА АДЛЮСТРОЎВАЕ ВАШ НАСТРОЙ?

**Максім Усовіч, перакладчык:**
— Першае, што прыходзіць у галаву, — слова «прышпільны». З настроем у мяне заўжды ўсё ў парадку, так што падыходзіць. Вельмі цікава чуць нейкія сучасныя паняцці на беларускай мове, хоць у жыцці я ёй не карыстаюся.

**Марына Казарына, студэнтка з Санкт-Пецярбурга:**
— Я не вялікі знаўца беларускай мовы, як можна зразумець. У Мінск прыехала ў госці на пару дзён. Але пакуль гуляла па крамах, некалькі слоў запомніла. Прыгожа гучыць, напрыклад, «цукеркі». Адразу ўзнікае асацыяцыя з чымсьці лёгкім і хрумсткім.

**Маргарыта Валодзька, білетны касір:**
— Маё любімае беларускае слова — «дранікі». Прычым любімае ў любым сэнсе. Размаўляю па-руску, але ў ім «р» чамусьці заўжды як у беларускай мове. І калі нехта кажа «драники» — мне гэта адразу рэжа слых.

**Алена Кухарчук, псіхолаг:**
— Падабаецца слова «Каляды». Яно гучыць неяк больш казачна, таямніча і святочна, чым «Рождество».

**Анатоль Яроцкі, супрацоўнік прыватнай фірмы:**
— Помню, аднойчы ў дзяцінстве паехаў да бабулі. Неяк яна мяне просіць: «Схадзі на кухню, прынясі дзяркач». Я як пайшоў, дык на паўгадзіны. Усё думаў, што за дзяркач. Аказалася — звычайны венік. А мае дзеці, відаць, значэнне і некаторых больш простых беларускіх слоў не ведаюць.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## «КАЖУЦЬ, ХЛЕБ НЕ ДАРАЖЭЭ. А ПОЙДЗЕШ У КРАМУ — ШТО БАЧЫШ?»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**УСЕ мы ходзім у крамы, рэгулярна набываем прадукты харчавання. Натуральна, ніколі не абыходзілася без таго, каб іншы раз большасць з нас не абмеркавала цэны — увогуле або на канкрэтных прыкладах. Так было, напэўна, заўсёды, аднак цяпер гэтая тэма набыла некалькі іншае «гучанне»...**

**— Вось вы патлумачце?!. Нам увесь час кажуць, што цэны на харчаванне не павялічваюцца. А пойдзеш у краму — што бачыш? За бохан хлеба літаральна нядаўна плаціў 3 450 рублёў, зараз — ужо 3 930. Батон каштаваў 3 930, цяпер за яго аддай 4 480 рублёў. Гэта пры тым, што і хлеб мясцовы, і батон — не вельмі смачныя. З Ганцавічаў возяць тое ж кожны тыдзень, дык там за батон і хлеб аддаі разам 6 220 рублёў, а ляжаць яны ва ўпакоўцы — будуць свежымі доўга. А нашы мясцовыя хоць адразу выкідай, — эмацыянальна распавяла па тэлефоне «гарачай лініі» жыхарка адной з вёсак Клецкага раёна.**

Усе каардынаты заяўніцы, як кажуць, у рэдакцыі ёсць, толькі жанчына прасіла іх не агучваць. Зрэшты, справа не ў канкрэтным прозвішчы, не ў назве населенага пункта. Падобныя пытанні да нас паступалі і раней. Пэўная праблема заключаецца ў тым, што з цягам часу на іх адказваць усё больш цяжка. Падавалася б, простая пастаноўка: чаму даражэюць прадукты? Давайце разам паспрабуем разабрацца. Як на бытавым узроўні, з пазіцыі пакупніка, так і з пункту гледжання вытворцаў, кантралюючых устаноў.

Па-першае, адразу варта падкрэсліць, што вельмі часта чытачы задаюць агульнае пытанне, але чакаюць канкрэтнага адказу. Вы заўважылі, што чытачка не агучыла ні назвы хлебабулачных вырабаў, ні іх вагі, ні даты куплі? Мы ўжо не згадваем пра адсутнасць звестак пра гатунак, рэцэптуру, вытворцу. І гэта ні ў якім разе не ў папрок. Давайце крыху паразважаем увогуле. Паводзіны канкрэтнага пакупніка — у многім тыповыя, як звычайнага спажыўца. Чалавек учора браў батон па такім кошце, сёння пайшоў — падавалася б, той самы батон прадаюць ужо даражэй. Чаму? А тое, што некалькі змянілася рэцэптура, назва, вага (нават пры вонкавым захаванні ранейшай упакоўкі), не заўважыў. І фактычна гаворка ідзе не пра адзін і той жа батон, а розныя хлебабулачныя вырабы. Ну, не адчуў на смак розніцы пакупнік, і не дзеля адной толькі назвы ён купляе пэўны прадукт... А гаворка ўсё адно досыць часта — пра розныя вырабы. Таму параўноўваць напрамую — у нашым выпадку — не зусім карэктна. Тым не менш, мы паспрабавалі атрымаць канкрэтную афіцыйную інфармацыю на тое ж пытанне: чаму даражэе хлеб у Клецкім раёне?

Вельмі аператыўную дапамогу ў гэтай справе рэдакцыі аказала **спецыяліст аддзела эканомікі Клецкага райвыканкама Галіна ЖДАНОВІЧ**.

— Пастановай Міністэрства эканомікі ад 19 верасня гэтага года №153 былі ўстаноўлены гранічныя максімальныя цэны на хлеб аржаны і аржана-пшанічны, батоны і хлябцы няздобныя з пшанічнай мукі вагой 300 грамаў і больш. Паколькі вытворчасць вышэйназваных відаў хлебабулачных відаў стратная для прадпрыемства (а ПУП «Клецкі вытворча-харчовы завод» у месяц выпрабляе іх 185-190 тон), было вырашана з верасня цалкам адмовіцца ад іх выпуску, паведаміла Галіна Канстанцінаўна. — Зараз прадпрыемства выпрабляе дыетычныя віды хлебабулачных вырабаў (77 працэнтаў ад агульнага выпуску), заварныя хлябы з выкарыстаннем дадатковай сыравіны імпартнага паходжання, а таксама здобныя булачныя вырабы — іншымі словамі, тыя віды хлебабулачных вырабаў, на якія не распаўсюджваецца дзеянне пастановы №153. За верасень фактычная рэнтабельнасць па хлебабулачных вырабах склала ад 0,5 да 5 працэнтаў, прычым некаторыя віды маюць адмоўную рэнтабельнасць. Таму было прынята рашэнне павялічыць цэны на хлебабулачныя вырабы на 7-14 працэнтаў.

Як бачым, вышэй сказана і пра гранічныя максімальныя цэны, і пра рэнтабельнасць, і пра дадатковую сыравіну імпартнага паходжання... Можна было б яшчэ пагаварыць пра адпускныя і рознічныя цэны, памеры гандлёвых надбавак і суб'ектаў гаспадарання, на якіх яны распаўсюджваюцца. Эканоміка — усё гэта разам. Як заўважыла ў нашай гутарцы Галіна Ждановіч, абапіраючыся на вышэйсказанае, ніякіх парушэнняў у цэнаўтварэнні няма. Толькі, вяртаючыся да канкрэтнай кішэні пакупніка, можна заўважыць: не кожны звычайны спажывец валодае гэткімі ведамі.

— Сапраўды, такія пытанні ўзнікаюць у грамадзян даволі часта. Што на іх можна адказаць? Індэкс спажывецкіх цэн адлюстроўвае змяненне ў часе кошту фіксаванага набору тавараў і паслуг, якія спажываюцца насельніцтвам. Статыстыка ўлічвае змяненне цаны на адзін і той жа тавар, прычым гэты тавар карыстаецца попытам, — паведаміла рэдакцыі **прэс-сакратар Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена КАНДРАЦЕНКА**. — Вы маеце рацыю, бывае, цалкам ідэнтычны тавар знікае з паліц крам, а просты пакупнік не звяртае ўвагі на тое, што параўноўвае не адно і тое ж. Але праблема яшчэ і ў тым, што чалавек лепш запамінае апошнюю — высокую — цану, па якой ён набываў тавар нядаўна. Пра тую ж цану, па якой ён набываў тавар, скажам, у пачатку лістапада, пакупнік ужо і забыўся. Патлумачу больш падрабязна. Індэкс спажывецкіх цэн, які быў агучаны ў снежні, паказаў змяненне іх у лістападзе ў параўнанні з кастрычнікам — іншымі словамі, тыя цэны, што былі месяц таму. Як будуць змяняцца цэны ў снежні — у параўнанні з лістападам — стане вядома ў студзені наступнага года. Такія тэрміны атрымання звестак.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

УНП 100984486

**ООО «ДинасИстейт»**
**СООБЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ ДОПОЛНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ,**
**опубликованную в газете «Звязда» № 233 (27097) от 07.12.2011 г.**

Объект: «Многоквартирные жилые дома, не относящиеся к домам повышенной комфортности, с помещениями административно-общественного назначения, выносом временной автостоянки УП «Гаражи, автостоянки и парковки» на пересечении ул. Крупской и ул. Малинина с многоярусной гараж-стоянкой по ул. Крупской, первый этап – строительство жилых домов №№ 9, 10, 11 и 12 по генплану».

Дополнительно предлагаются для заключения договоров создания объектов долевого строительства для граждан, **не состоящих** на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, следующие квартиры:

В жилых домах № 10 и № 12 по генплану:

Две трехкомнатные квартиры общей площадью от 72,43 м² до 81,96 м² – цена 1 м² общей площади 7 450 000 рублей.

**27 декабря 2011 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО ПСФ «Гродноремстрой».**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О наименовании общества.
2. О внесении и утверждении изменений и дополнений в устав общества.
3. О совершении сделок общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Гродно, ул. Дзержинского, 17.
Начало регистрации участников собрания: 13.30.

*УНП 500167057*

Акцыя «Нашы сэрцы — хворым дзецям»

## У ДОМІКУ ДЗЕДА МАРОЗА МОЖНА ПАКІНУЦЬ... ПАДАРУНАК

**СЁННЯ, 17 снежня, стартуе традыцыйная рэспубліканская дабрачынная акцыя Беларускага дзіцячага фонду «Нашы сэрцы — хворым дзецям». У Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі ў сталіцы збяруцца звыш 200 дзяцей-сірот, якія знаходзяцца пад апекай або выхоўваюцца ў сямейных дзіцячых дамах па ўсёй краіне, а таксама дзеці з цяжкімі захворваннямі і дзеці з малазабяспечаных сем'яў. Артысты Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці падрыхтавалі для іх вясёлую святочную праграму, а Дзіцячы фонд — салодкія падарункі.**

Да 10 студзеня валанцёры і актывісты БДФ наведаюць дзіцячыя аддзяленні бальніц, школы-інтэрнаты і дзіцячыя дамы ва ўсіх абласных і раённых цэнтрах. Каля 15 тысяч беларускіх дзяцей, якія аказаліся ў складанай жыццёвай сітуацыі, атрымаюць навагоднія віншаванні і дапамогу.

8 студзеня Дзіцячы фонд сумесна з Епархіяльным упраўленнем Беларускай Праваслаўнай царквы, Дэпартаментам па ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС МНС Беларусі, Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі запросяць дзяцей, перасяленцаў з забруджаных тэрыторый і дзяцей-сірот на сустрэчу да мітрапаліта Філарэта ў Кафедральны сабор Беларусі і на навагоднее свята.

А яшчэ ўсе наведвальнікі доміка Дзеда Мароза ў парках Мінска могуць стаць удзельнікамі акцыі «Нашы сэрцы — хворым дзецям». Падчас сустрэчы вашага дзіцяці з Дзедам Марозам можна пакінуць у яго доміку падарунак для другога дзіцяці. БДФ перадасць усе гэтыя падарункі дзецям, якія маюць у іх патрэбу.

Акцыю «Нашы сэрцы — хворым дзецям» падтрымалі ЗП «Цэптар Інтэрнацыянал», ЗП «Алвеста-М», «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь», ЗТАА «Белбагемія», ІП А.А. Гігеня, ТАА «Белрампрам», events company «ARTMIX», а таксама Рэгіна Папова і Таццяна Кунцэвіч.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Перадсвяточны суботнік «За чысты горад!»

**У Віцебску 17 снежня пройдзе агульнагарадскі суботнік.**

Паводле слоў **начальніка аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віцебскага гарвыканкама Валерыя КІРСАНАВА**, суботнік-акцыя «За чысты горад!» праводзіцца спецыяльна, каб навесці парадак перад каляднымі і навагоднім святамі. Адказныя асобы «камуналкі» напярэдадні агледзелі «праблемныя» двары, вулачкі і вызначылі «фронт» работ. Нямала «падказак» ад гараджан наконт таго, дзе трэба навесці парадак, гарадскія чыноўнікі атрымалі падчас нядаўняй «прамой тэлефоннай лініі». Арганізацыі ўсіх формаў уласнасці і ведамаснай падпарадкаванасці, калектывы вышэйшых, сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў будуць наводзіць парадак на ўласных і замацаваных за імі тэрыторыях, а таксама на сваіх працоўных месцах.

Кіраўнікі Віцебскага гарвыканкама вераць, што агульнымі намаганнямі віцябляне зробяць свой горад яшчэ прыгажэйшым!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**г. ВИТЕБСК** **28.12.2011**

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи лота, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 7. | Не завершенный строительством объект – завод глиняного кирпича, расположенный по адресу: Витебская область, Чашникский район, Лукомльский с/с, северо-западнее д. Стражевичи | Характеристика объекта недвижимости: не завершенный строительством объект – завод глиняного кирпича. Земельный участок: с кадастровым номером 225183012101000094, площадь 26,3065 га для использования под производственную базу. Назначение – для использования под производственную базу. | **Одна базовая величина** | **Одна базовая величина** |
| 8. | Незавершенный строительством объект «Музей-усадьба И. Буйницкого», расположенный по адресу: Витебская область, Глубокский район, Прозорокский с/с, д. Прозороки, ул. Вокзальная, 22 | Характеристика объектов недвижимости: не завершенный строительством объект, общая площадь 505,7 кв.м, фундамент – ж/б блоки, перекрытия – ж/б плиты, стены блочные – облицованные кирпичом, кровля – нет, полы – нет, проемы – нет, внутренняя отделка – нет. Процент готовности – 10 %. Земельный участок: с кадастровым номером 221585411601000187 площадью 0,2567 га для обслуживания объекта «Музей-усадьба И. Буйницкого». | **Одна базовая величина** | **Одна базовая величина** |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон/факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: fondvitebsk@tut.by.**

**ПРОДАВЕЦ: лота № 7** – Дирекция строящегося государственного предприятия «Завод глиняного кирпича», контактные телефоны (02133) 31333, 37637;

**лота № 8** – Учреждение «Государственный музей истории театральной и музыкальной культуры Республики Беларусь», контактный телефон (017) 2270544.

**Условия продажи недвижимости:** по лоту № 7 – осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте, создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи; по лоту № 8 – создание на территории приобретаемого объекта постоянно действующей экспозиции, посвященной деятельности И. Буйницкого; осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте; создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

**Аукцион состоится «28» декабря 2011 г.** в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

1. Для участия в аукционе приглашаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Представителем заявителя (кроме случая, когда юридическое лицо представляет его руководитель) предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости (для представителя иностранного юридического лица) легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 27.12.2011 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 28.12.2011 с 14.00 до 15.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на **расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495**.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11.03.2010 № 342. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

7. Извещения о проведении аукционов были опубликованы ранее в газете «Звязда» от 27.09.2011 № 184 (27047), от 21.09.2011 № 180 (27044).

Доктар адкажа

## ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

**На будучым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:**

**19 снежня** — намеснік галоўнага ўрача мінскага гарадскога скурвендыспансэра Алена Іванаўна РАКАВЕЦКАЯ.

**20 снежня** — намеснік дырэктара РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Леанід Мікалаевіч ЛОМАЦЬ.

**21 снежня** — намеснік галоўнага санітарнага ўрача Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Наталля Паўлаўна ЖУКАВА.

**22 снежня** — намеснік галоўнага ўрача мінскай гарадской МРЭК Святлана Аляксееўна ЦІТКО.

**23 снежня** — намеснік галоўнага ўрача мінскай гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Алег Анатольевіч ВАРАБЕЙ.

**«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25**

**19 снежня** — загадчык практалагічнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы Віктар Канстанцінавіч ЦІХАН.

**20 снежня** — загадчыца нефралагічнага аддзялення Мінскай абласной дзіцячай бальніцы Таццяна Аляксандраўна КАВАЛЕЎСКАЯ.

**21 снежня** — загадчыца пульманалагічнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы Таццяна Анатольеўна ЗЯЛЕНСКАЯ.

**22 снежня** — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы Валерый Міхайлавіч УСНІЧ.

**23 снежня** — загадчык рэнтгеналагічнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы Анатоль Уладзіміравіч ЛОЙ.

## РЭПЕТЫТАРАЎ БОЛЬШ, ЧЫМ ФАТОГРАФАЎ

У Віцебскай вобласці афіцыйна ажыццяўляюць дзейнасць каля 170 рэпетытараў. За 11 месяцаў года імі заплачана 62,6 мільёна рублёў адзінага падатку. Для параўнання: музычнае абслугоўванне розных урачыстасцяў, паслугі тамады, фатаграфаванне ажыццяўляюць 111 грамадзян (заплацілі разам 42,1 мільёна рублёў падаткаў), 86 чалавек афіцыйна займаюцца гадоўляй кацянят і шчанюкоў.

Усяго ў Віцебскай вобласці грамадзянамі, якія ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць па так званым заяўным прынцыпе (а іх больш за 4,6 тысячы чалавек), за 11 месяцаў 2011 года ў бюджэт было выплачана 1,5 мільярда рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Общество с ограниченной ответственностью «ПРИВАТКОМ», УНП 391434171, 24 января 2012 г. в 8.30 по адресу: г. Орша ул. Ленина, 221, ком. 1 проводит открытый аукцион по продаже права на заключение договоров аренды на срок с 01.02.2012 г. по 31.07.2012 г. торговых объектов, расположенных в г. Орша**

| № лота | Начальная цена лота (бел. руб.) | Размер задатка (бел. руб.) | № торгового объекта | Адрес арендуемого объекта | Площадь (м кв.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 6 240 000 | 1 092 000 | 2 | ТЦ «Никольский» | 12,3 |
| 2 | 6 140 000 | 1 074 500 | 3 | ТЦ «Никольский» | 12,1 |
| 3 | 15 680 000 | 2 744 000 | 26 | ТЦ «Никольский» | 30,9 |
| 4 | 12 440 000 | 2 177 000 | аптека | ТЦ «Никольский» | 24,5 |
| 5 | 6 300 000 | 1 102 500 | 16 | ТЦ «Никольский» | 12,4 |
| 6 | 12 640 000 | 2 212 000 | 6 | ТЦ «Никольский» | 24,9 |
| 7 | 6 240 000 | 1 092 000 | 7 | ТЦ «Никольский» | 12,3 |
| 8 | 6 100 000 | 1 067 500 | 17 | ТЦ «Никольский» | 12,0 |
| 9 | 12 600 000 | 2 205 000 | 18 | ТЦ «Никольский» | 24,8 |
| 10 | 9 800 000 | 1 715 000 | 28 | ТЦ «Никольский» | 19,3 |
| 11 | 6 340 000 | 1 109 500 | 10 | ТЦ «Никольский» | 12,5 |
| 12 | 6 200 000 | 1 085 000 | 20 | ТЦ «Никольский» | 12,2 |
| 13 | 6 240 000 | 1 092 000 | 15 | ТЦ «Никольский» | 12,3 |
| 14 | 7 880 000 | 1 379 000 | 22 | ТЦ «Никольский» | 15,5 |
| 15 | 7 880 000 | 1 379 000 | 23 | ТЦ «Никольский» | 15,5 |
| 16 | 18 680 000 | 3 269 000 | 24а | ТЦ «Никольский» | 36,8 |

Арендная плата за месяц: 0,6 базовой величины за 1 кв.м арендуемой площади.

Условия продажи: розничная торговля непродовольственными товарами (оказание услуг), лот № 4 – для размещения аптеки.

Условия оплаты: оплата за право заключения договора аренды осуществляется в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона. Возможна оплата в рассрочку с заключением договора.

Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену за выставленный на продажу лот.

Договор аренды заключается после подписания протокола и оплаты за право заключения договора аренды (заключения договора на оплату в рассрочку).

Для участия в аукционе необходимо:
- подать заявку установленной формы;
- уплатить задаток на р/с 3012371280016 в отделении № 630 г. Орша головного филиала по Витебской области ОАО «Белинвестбанк», БИК 150801701, ОКПО 14402185, адрес банка: г. Орша, ул. Ленина, 26а;
- подписать соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставить копии учредительных документов с предъявлением оригинала либо нотариально заверенные.

Заявки на участие принимаются по адресу: г. Орша, ул. Ленина, 221, ком. 1 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. В день проведения аукциона заявки не принимаются.

**Тел.: (0216) 229994, (029) 2998222.**

**Страховое свидетельство** по добровольному страхованию грузов № 002065 серия НС ЗАСО «Белнефтестрах» **считать недействительным**.

### ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревнях Дубники, Верхмень, Дуброва, Пелика Курганского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2. | Дата, время и место проведения аукциона | 18 января 2012 года в 15.00, д. Курганье, ул. Центральная, 8, Курганский сельисполком, зал заседаний |
| 3. | Продавец и его адрес | Курганский сельский исполнительный комитет, д. Курганье, ул. Центральная, 8 |
| 4. | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | **Лот № 1** — площадь 0,2001 га, № 624882502601000002, д. Дубники<br>**Лот № 2** — площадь 0,2001 га, № 624882502601000003, д. Дубники<br>**Лот № 3** — площадь 0,1995 га, № 624882501601000133, д. Верхмень<br>**Лот № 4** — площадь 0,2500 га № 624882503101000071, д. Дуброва<br>**Лот № 5** — площадь 0,2221 га, № 624882507101000013, д. Пелика |
| 5. | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6. | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7. | Начальная (стартовая) цена продажи | **Лот № 1** — 4 565 282 рубля<br>**Лот № 2** — 4 565 282 рубля<br>**Лот № 3** — 16 689 173 рубля<br>**Лот № 4** — 30 208 750 рублей<br>**Лот № 5** — 14 638 610 рублей |
| 8. | Условия аукциона | А) Продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9. | Наличие инженерной инфраструктуры | д. Дубники — электроснабжение, грунтовая дорога; д. Верхмень — электроснабжение, асфальтированный подъезд; д. Дуброва — электроснабжение, водоснабжение, асфальтированный подъезд; д. Пелика — электроснабжение, грунтовая дорога |
| 10. | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 5-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11. | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3641000000045, филиал 616 АСБ «Беларусбанк», ЦБУ 621 г. Смолевичи, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12. | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | Каждый вторник в 10.00 |
| 13. | Окончательный срок приема документов | 16 января 2012 года в 13.00 |
| 14. | Контактные телефоны | 8 01776 46 2 36, 46 2 46, 46 2 37 |

Расходы по организации и проведению аукциона (лоты №№ 1, 2, 3, 4, 5) — 1 523 388 рублей каждый, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

**Примечания:** для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам -- документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

### Извещение об открытом аукционе по продаже права аренды земельных участков в г. Гродно

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.) | Условие продажи и целевое использование земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Право аренды земельного участка сроком на 25 лет | м-н «Южный-2» позиция по генплану № 107 | 0,2495 | 440100000001006722 | 139 000 000 | 13 900 000 | 3 947 451 | Строительство продовольственного магазина с помещениями обслуживания.* Возмещение затрат в сумме 45 245 460 руб. |
| 2. | Право аренды земельного участка сроком на 25 лет | м-н «Южный-2» позиция по генплану № 101 | 0,2778 | 440100000001006721 | 154 000 000 | 15 400 000 | 4 783 658 | Строительство продовольственного магазина с помещениями обслуживания.* Возмещение затрат в сумме 50 745 063 руб. |
| 3. | Право аренды земельного участка сроком на 25 лет | м-н «Барановичи-1» | 0,3427 | 440100000003003455 | 373 000 000 | 37 300 000 | — | Строительство магазина продовольственных и сопутствующих товаров, кафе, пункт бытового обслуживания населения* |
| 4. | Право аренды земельного участка сроком на 25 лет | м-н «Зарица» | 0,2697 | 440100000003003797 | 191 000 000 | 19 100 000 | — | Строительство предприятия торговли и общественного питания* |

*Победитель аукциона обязан в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года, а также осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка** на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости» с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10-ти рабочих дней с момента вынесения решения горисполкома о передаче земельного участка победителю аукциона.

3) Победитель аукциона по продаже права аренды земельных участков обязан в течение 10-ти рабочих дней с даты принятия решения горисполкома о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации.

4) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

**Аукцион состоится 17 января 2012 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**. Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57 в рабочие дни с 8.00 до 17.00 **с 19 декабря 2011 г. по 11 января 2012 г.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

# Прыбытак — вышэй за ўсё, але галоўнае — ЯКАСЦЬ

## Што карэспандэнты «Звязды» бачылі і чулі на прадпрыемствах ААТ «Гомельхлебапрадукт»


Генеральны дырэктар Эдуард БАШАК.




Прадаўцы фірменнага магазіна «Меленка» Галіна ГАРАВАЯ і Кацярына ЛАПІЦКАЯ.




Зернесушыльны комплекс з ёмістасцямі для захоўвання збожжа

### ВЫТОКІ І НАПЕРАД КРОКІ

Адкрытае акцыянернае таварыства бярэ свой пачатак у дарэвалюцыйным перыядзе, калі на тэрыторыі сённяшняга крупазавода працаваў купецкі млын па вытворчасці шатраванай мукі. Прымітыўнае абсталяванне дазваляла выпрацоўваць яе 10 тон за суткі. Рэканструкцыя ж у 1926-1927 гадах павялічыла выпуск гэтага прадукту да 35 тон. Але ішоў час, і прадпрыемства ўдасканальвалася тэхнічна, пашырала асартымент тавару. Быў пабудаваны млын трохгатунковага памолу на іншай тэрыторыі, а ранейшы пераабсталяваны на выпрацоўку ячнай і аўсянай круп, а крыху пазней устанавілі там крупадзёрку па перапрацоўцы грэчкі ў крупы.

Перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны крупазавод перапрацоўваў ужо 105 тон аўса, грэчкі і ячменю за суткі. Пасля вызвалення Гомеля прадпрыемства было адноўлена і з 1949 года пачало перапрацоўваць толькі грэчку з сутачнай прадукцыйнасцю 30-35 тон, а калі была праведзена рэканструкцыя, то яно давяло выраб прадукту да 180 тон. Дарэчы, тут упершыню ў СССР была прыменена гідратэрмічная апрацоўка грэчкі, пры якой з дапамогай цяпла і пары атрымліваліся крупы, якія хутка разварваліся.

У 1934 годзе ў іншым месцы горада ўступілі ў строй млын прадукцыйнасцю 100 тон за суткі трохгатунковага памолу і элеватар ёмістасцю 8 тысяч тон. Такога сучаснага абсталявання, якім яны былі аснашчаны, не мела ніводнае аналагічнае прадпрыемства Беларусі. У час вайны і млын, і элеватар былі разбураны, а пасля яе, у 1947 годзе, пачалося будаўніцтва новага жалезабетоннага элеватара з наступнай прыбудовай яшчэ трох сіласных карпусоў. У 1964 годзе новы двухсекцыйны млын пачаў перапрацоўваць 180 тон пшаніцы і 100 тон жыта за суткі.

Да 1996 года прадпрыемства называлася Гомельскім камбінатам хлебапрадуктаў і за поспехі ў развіцці мукамольна-крупяной вытворчасці тройчы выходзіла пераможцам ва Усесаюзным спаборніцтве з прысуджэннем пераходнага Чырвонага Сцяга Савета Міністраў СССР і ЦК прафсаюза сельскай гаспадаркі і нарыхтовак. А ў 1971 годзе Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР камбінат быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

— Затым камбінат быў ператвораны ў Гомельскае вытворчае аб'яднанне хлебапрадуктаў, якое ў сваю чаргу 31 снежня 1999 года рэфармавалася ў ААТ «Гомельхлебапрадукт», — расказваюць генеральны дырэктар Эдуард Башак і яго намеснік Павел Кустаў. — У працэсе рэфармавання да таварыства далучылі Рагачоўскае хлебапрыёмнае прадпрыемства, філіялы «Навабеліцкі камбінат хлебапрадуктаў» і «Гомельскі камбінат хлебапрадуктаў», а летась і КСУП «Андрэеўка-Агра», што ў Буда-Кашалёўскім раёне.

Сёння адкрытае акцыянернае таварыства «Гомельхлебапрадукт» валодае магутным вытворчым патэнцыялам. Яно мае ў сваім складзе млынзавод па вытворчасці пшанічнай і жытняй мукі, манных круп; камбікормавы комплекс прадукцыйнасцю 520 тон за суткі рассыпных камбікармоў з аўтаматызаваным дазаваннем і 220 тон за суткі гранулявaных камбікармоў; цэхі па вытворчасці крупаў грэцкіх, аўсяных, ячных; гароха, шматкоў і каш хуткага прыгатавання. У прыватным прадпрыемстве «Андрэеўка» займаюцца раслінаводствам і жывёлагадоўляй, і мы плануем вывесці гаспадарку на стабільную работу.

Акрамя сваёй асноўнай дзейнасці прадпрыемства аказвае паслугі па захаванні збожжа і прадукцыі і выпрацоўцы мукі і круп грэцкіх з давальніцкай сыравіны; расфасоўцы гатовай прадукцыі ў прапіленавую ўпакоўку па 0,5-1 кг.

Перад нашым калектывам, — працягваюць свой аповед Эдуард Сяргеевіч і Павел Уладзіміравіч, — стаяць задачы далейшай мадэрнізацыі вытворчасці, атрымання высокіх прыбыткаў, змяншэнне выдаткаў на выпуск дабраякаснай прадукцыі. На ўказаныя арыенціры нацэлены ўсе работнікі, незалежна ад таго, якую пасаду яны займаюць.

Праўду казалі кіраўнікі прадпрыемства, мы пераканаліся, калі пабывалі ў двух філіялах прадпрыемства і ўсё ўбачылі на свае вочы.

### ПІЛЬНАЕ ВОКА ЛАБАРАТОРЫІ

Галоўнага тэхнолага ААТ Людмілу Філатаву мы сустрэлі ў цэнтралізаванай вытворча-тэхналагічнай лабараторыі філіяла «Гомельскі камбінат хлебапрадуктаў», і яна расказала пра тое, што ў яе складзе разам з аддзяленнямі ў крупяным цэху і на рэалізацыйнай базе працуе 25 чалавек. Гэта спецыялісты высокай кваліфікацыі.

У той дзень на пасту радыялагічнага кантролю была занята інжынер-радыёлаг Аксана Юрчанка, якая вызначала ў адабранай партыі пшаніцы, жыта і грэчкі ўтрыманне стронцыю. У гэты ж самы час Вера Тарасава і Вольга Раманчыкава, выпускнікі Маладзечанскага політэхнічнага тэхнікума, вызначалі якасць мукі і зерня ў іншых лабараторыях.

Нас зацікавіла такое пытанне: а ці праводзіць лабараторыя прадпрыемства кантроль на ўтрыманне ў збожжы радыеактыўнага цэзію? У адказ пачулі дэталёвае тлумачэнне не толькі па ім. Напрыклад, калі з гаспадарак тое збожжа вязуць на прадпрыемства для яго захоўвання і затым перапрацоўкі, дык у КСУПах і СВК яно ўжо праверана па многіх характарыстыках, аб чым ААТ прадстаўляюцца адпаведныя дакументы. Але лабаранты ўсё роўна робяць пераправеркі. А вось на ўтрыманне ў збожжы стронцыю адабраныя ўзоры збожжа з камбіната хлебапрадуктаў перадаюцца ў абласны цэнтр па метралогіі і стандартызацыі.

Гэта пакуль што. Калі ж лабараторыя прадпрыемства будзе акрэдытавана (а падрыхтоўчыя работы да гэтага ўжо вядуцца поўным ходам), то ўказаныя функцыі будуць перададзены ёй.

Наогул жа дыяпазон дзеянняў лабараторыі вялікі, і яна аснашчана такім сучасным абсталяваннем і інструментам, што за хвіліну-паўтары можа атрымаць усе зададзеныя паказчыкі сыравіны і прадукцыі — на вільготнасць, белізну, засмечанасць, клейкавіну і г.д.

І ў тым, што на прадпрыемстве ўкаранёна сістэма менеджменту якасці ІСО-2001, якая адпавядае міжнародным патрабаванням, сістэма ІСО-14000 (ахова навакольнага асяроддзя) і сістэма ІСО-18000 (кіраванне аховай працы), ёсць немалая заслуга работнікаў лабараторыі. Зараз курс узяты на ўкараненне сістэмы кіравання якасці і бяспекі харчовай прадукцыі на аснове аналізу рызык і крытычных кантрольных кропак НАССР.


Дырэктар філіяла «Гомельскі камбінат хлебапрадуктаў» Міхаіл БЕЛАШЫЦКІ.


Галоўны тэхнолаг філіяла «Гомельскі камбінат хлебапрадуктаў» Людміла ФІЛАТАВА.


Начальнік цэха крупяной вытворчасці Ірына МУЗЫЧЭНКА (справа) і апаратчыца Юля ПАТАПЕНКА.


Інжынер-радыёлаг вытворча-тэхналагічнай лабараторыі Аксана ЮРЧАНКА.

### ПА ШЛЯХУ РЭКАНСТРУКЦЫІ

Дырэктар філіяла «Гомельскі камбінат хлебапрадуктаў» Міхаіл Белашыцкі звярнуў нашу ўвагу на тое, што прадпрыемства, якое ён узначальвае, цесна кантактуе з гаспадаркамі АПК рэспублікі. Яно не толькі закупляе ў вытворцаў збожжа, але і плануе разам з імі аб'ёмы пасяўных плошчаў, насеннага матэрыялу, сродкаў аховы раслін і г.д. Усім вядома, які быў капрызным сёлетні год для вырошчвання збажыны, як і тое, у якім дэфіцыце знаходзіліся грэцкія крупы.

Дык вось, у выніку прынятых мер прадпрыемствам было нарыхтавана 17,5 тысячы тон грэчкі, і нарыхтоўка яе працягваецца. Крупазавод, які ўваходзіць у склад філіяла, у рэспубліцы мае самыя вялікія вытворчыя магутнасці для перапрацоўкі — 38 тысяч тон. Дэфіцыту грэцкіх круп, як гэта відаць ужо зараз, не будзе.

— У 2007 годзе, — расказвае Міхаіл Пятровіч, — была прынята адпаведная пастанова Савета Міністраў аб развіцці крупяной прамысловасці, у якой былі вызначаны канкрэтныя задачы па гэтым пытанні і сельскагаспадарчым прадпрыемствам, і нам. Дык вось, мы ў крупяным цэху правялі рэканструкцыю вытворчасці, на якую ў цэнах таго часу было зрасходавана звыш двух мільярдаў рублёў.

**— І дзякуючы гэтаму выйшлі на тыя магутнасці — звыш 38 тысяч тон за год?**

— Правільна. Мадэрнізацыя вытворчасці ў сукупнасці са стараннем і творчымі адносінамі да даручанай работы нашага персаналу зрабілі сваю справу. Мы атрымалі пры дапамозе тэндарных здзелак патрэбную колькасць высокапрадукцыйнага італьянскага, польскага і расійскага абсталявання. У выніку палепшылі якасць прадукцыі, дасягнулі значнай эканоміі энергарэсурсаў і на пяць працэнтаў павялічылі выпуск грэцкіх круп вышэйшага гатунку, якія ідуць на прыгатаванне грэцкіх шматкоў. Дарэчы, да слоў Людмілы Іосіфаўны аб тым, што мы гатовы ўкараніць сістэму НАССР, дадам наступнае: гэтае пытанне звязана і з рэканструкцыяй млына, якую мы таксама правядзём.

**— Значыць, і там мадэрнізацыя вытворчасці пройдзе?**

— А без гэтага сёння нельга. Рыхтуем па гэтым пытанні бізнэс-план і праектна-каштарысную дакументацыю, правядзём тэндарныя таргі на паэтапную закупку абсталявання.

Усе прагнозныя паказчыкі за адзінаццаць месяцаў мы выканалі. Паспяхова справіліся і з самым галоўным паказчыкам — рэнтабельнасцю. З якасцю прадукцыі — таксама поўны парадак. Вытрымліваем прапорцыі паставак яе як на ўнутраны, так і на знешні рынкі.

**— І праблем ніякіх, звязаных з фінансава-эканамічным крызісам, у вас няма?**

— Яны могуць быць толькі ў залежнасці ад якасці збожжа і аб'ёмаў закупак яго. Сёлета грэчкі было пастаўлена нам больш, чым летась, а вось пшаніцы з гаспадарак Гомельшчыны — менш, ды па якасці яна была горшая, чым летась.

У гутарку ўступае **намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Гомельхлебапрадукт» Павел КУСТАЎ:**

— Сёлетні год неардынарны, бо, улічваючы дэфіцыт крупяной прадукцыі, з аднаго боку, і парытэт цэн з Расіяй на яе, з другога, нам дазволена на экспарт пастаўляць толькі муку пшанічную і жытнюю. Грэчкі сваёй зараз хапае, і ў магазінах круп дастаткова, а раней закуплялі яе ў Кітаі, Польшчы, Расіі. Адсюль 90 працэнтаў прадукцыі камбіната ідзе на ўнутраны рынак і 10 — на экспарт.


Інструктар-метадыст па спорце Дзмітрый ЮШКЕВІЧ дэманструе новае спартыўнае абсталяванне.

### НА КРУПАЗАВОДЗЕ

Нашымі гідамі там былі вышэйназваныя Павел Уладзіміравіч і Людміла Іосіфаўна. У вочы адразу кінуліся чысціня і парадак на тэрыторыі, малады сад, альтанка. У адным з цэхаў нам паказалі зманціраванае летась новае абсталяванне па ачыстцы круп па колеры. Гэта самая сучасная машына італьянскай фірмы «Окрым», якая рэзка павысіла якасць прадукцыі па таварным выглядзе і па наяўнасці неабадранага зерня грэчкі. Аптычны сартавальнік яе выдзяляе з гатовай ядрыцы прымесі, якія маюць іншы колер, і гэта дае магчымасць цалкам убіраць з ядрыцы луску (шалупінне) і іншыя прымесі.

Сёлета была рэканструявана кацельня па праграме энергазберажэння. А менавіта: быў заменены адзін кацёл маркі ДКВР-4 на парагенератар, і гэта дало вялікую эканомію газу. Далейшыя падобныя работы наперадзе. Зроблен таксама рамонт фасада тэхналагічнага цэха.

У гідратэрмічным аддзяленні мы назіралі за работай чатырох прапарвальнікаў, два з якіх былі ўстаноўлены сёлета. Збожжа там варыцца на працягу пяці хвілін пад ціскам у 2,5 атмасферы. Кантроль за працэсам вяла аўтаматыка.

Расказваць аб рабоце крупазавода можна доўга. Вынік намаганняў яго персаналу такі: ён цалкам закрывае патрэбнасці рэспублікі ў грэцкіх крупах і пры неабходнасці можа адгружаць іх на экспарт.


Намеснік генеральнага дырэктара Павел КУСТАЎ.


Аператар Алена СІЛЬЧАНКА, зменны майстар Галіна ЮРЧАНКОВА, начальнік цэха Мікалай ПАЎЛЯНОК, вядучы інжынер-тэхнолаг Наталля ЛІМАРЭНКА і старшы майстар Галіна ПАДАСІНАВА.

### ВОСЬ ТАКАЯ ФІЛАСОФІЯ

У адным з падраздзяленняў філіяла «Навабеліцкі камбінат хлебапрадуктаў» мы звярнулі ўвагу на плакат, на якім быў прыведзены выраз Георга Вільгельма Фрыдрыха Гегеля: «Нешта перастае быць тым, што яно ёсць, калі яно губляе сваю якасць». Першапачаткова падумалася: а якое дачыненне маюць гэтыя словы вядомага нямецкага філосафа да работы ўказанага прадпрыемства? Калі ж пазнаёміліся з дзейнасцю яго калектыву, дык зразумелі: аказваецца, самае непасрэднае. Бо, сапраўды, тое нешта, губляючы сваю якасць (у працы, у канчатковым прадукце яе, і г.д), на самой справе ўжо не тое, «што яно ёсць». Філасофія жыцця, нічога не скажаш. Вось яе і прытрымліваюцца ў філіяле. Але аб усім па парадку.

Прадпрыемства знаходзіцца на ўскраіне Гомеля, там, дзе пачынаюцца лясы. Мясцовасць пераважна забалочаная, са слабым грунтам, што назіраецца і на асобных участках тэрыторыі камбіната. А яна пастаянна асвойваецца, бо вытворчыя магутнасці растуць, і ўсё патрэбна ўвязваць у адзіны надзейны комплекс, каб і затратнасць у выпуску прадукцыі зніжаць, і якасць яе паляпшаць. У гэтым напрамку заслугоўвае ўвагі такі вось эпізод з жыцця прадпрыемства.

За год прадпрыемства перапрацоўвае 110-120 тысяч тон збожжа, ёмістасці для захоўвання якога разлічаны на 48 тысяч тон. Пасля збору ўраджаю сюды паступае 70-80 тысяч тон, і таму для размяшчэння яго даводзіцца арандаваць плошчы на іншых прадпрыемствах, у тым ліку і за межамі вобласці. А гэта і транспартныя расходы, і аплата ў пяць тысяч рублёў у месяц за захоўванне адной тоны збожжа. А тут — тысячы іх. Вось і лічы, у колькі ўсё абыходзіцца.

Таму на прадпрыемстве і ўзяліся за нялёгкую справу. У 2009 годзе пабудавалі адну сушылку збожжа, у 2010-м — другую, а сёлета — дзесяць ёмістасцяў на захоўванне 20 тысяч тон збожжа. Ды як і дзе пабудавалі? На тэрыторыі (іншага месца і не было) з забалочанай мясцовасцю. Давялося высекчы хмызняк, выбраць пяць тысяч кубаметраў грунту, завезці новы і пад кожную ёмістасць забіць па 24 жалезабетонныя палі, на якіх і трымаецца падмурак збудаванняў.

Вялізны пласт работы? Вядома ж. Але для чаго? Каб дасягнуць новай якасці. У выніку толькі за месяц эканоміцца 150 мільёнаў рублёў. І яшчэ такія дэталі. Калі праз тыя дзве сушылкі прайшло раней 17 тысяч тон збожжа, дык сёлета — 40 тысяч. А зараз на прадпрыемстве выконваюцца работы па пракладцы тэхналагічнай лініі, якая ў вытворчым працэсе злучыць у адзін комплекс элеватар з тымі сушылкамі і дзесяццю ёмістасцямі для захоўвання збожжа. Зноў жа новая якасць работ, зноў жа эканомія фінансавых сродкаў, бо адпадае неабходнасць у выкарыстанні на тыя тэхпрацэсы вагонаў ці аўтатранспарту.

### У ШАЛУПІННЯ З'ЯВІЛАСЯ ПЕРСПЕКТЫВА

Расказваючы гэта на той новабудоўлі і паказваючы яе, дырэктар філіяла Сяргей Старацітараў не прамінуў правесці нас і да таго месца, дзе чакала мантажу новае абсталяванне вядомай італьянскай фірмы, прызначанае для забеспячэння тэхналагічнай патрэбнасці гарачай вадой і ацяплення ўсіх памяшканняў у асенне-зімовы перыяд. Сутнасць справы ў тым, што за выкарыстанне газу прадпрыемства выдаткоўвае 650 мільёнаў рублёў у месяц. За год — зусім не цяжка падлічыць колькі. А ў філіяла толькі невялікая частка адходаў вытворчасці (аўсянага шалупіння) ідзе на рэалізацыю іншым прадпрыемствам. Вось і вырашана было, як гаворыцца, выкарыстаць яго «на поўную катушку» — спальваць у тым катле, коштам два мільярды рублёў, які за гадзіну здольны выпрацоўваць пяць тон пары. Выгада ад гэтага будзе адчувальная.

### ТРАДЫЦЫІ ЖЫВУЦЬ

Між іншым, падобныя захады калектыву, накіраваныя на пошукі рэзерваў вытворчасці, больш эфектыўнай і якаснай работы, былі характэрныя для прадпрыемства і раней, калі яно было самастойным і да размоў аб стварэнні акцыянерных таварыстваў справа яшчэ, напэўна, не даходзіла. Аб гэтым нам сказаў намеснік генеральнага дырэктара ААТ Павел Уладзіміравіч Кустаў.

Яшчэ да распаду Савецкага Саюза была зроблена аплата нямецкай фірме «Бюллер» за пастаўку найноўшага абсталявання і тэхналогіі, якія павінны былі забяспечыць дыстанцыйнае кіраванне крупяной вытворчасці. А за шэф-мантаж і шэф-наладку таго абсталявання патрэбна было заплаціць ужо нашай маладой краіне Беларусі 800 тысяч долараў. Такой валюты на гэтыя мэты ў рэспубліцы не было. І калектыў прадпрыемства, упэўнены ў сваіх сілах, выказаў пажаданне ўзяцца за гэтая адказныя работы самім. І перамаглі ўсе цяжкасці! Зберагалі тыя фінансавыя сродкі. А Сяргей Міхайлавіч Старацітараў быў прызнаны інжынерам года сістэмы хлебапрадуктаў Беларусі.

Як бачым, традыцыі жывуць і напаўняюцца новым зместам.


Дырэктар філіяла «Навабеліцкі камбінат хлебапрадуктаў» Сяргей СТАРАЦІТАРАЎ.

**Матэрыялы падрыхтавалі Віктар БОЙКА, Алена ДАЎЖАНОК, Марыя ЖЫЛІНСКАЯ (фота).**


На новай фасовачнай лініі аператар Арцём МАЙСЕЕНКА.

**НАШ АДРАС:**
ААТ «Гомельхлебапрадукт»,
246006, г. Гомель,
вул. Мазурава, 48,
тэл. 8 (0232) 72 58 63,
факс 72 58 87
УНП 400010980


Аператары Ірына САЛАЎЁВА, Таццяна КАРБАЧОВА і Вольга ТАРАСЮК працуюць на сучасным фасовачна-ўпаковачным абсталяванні.

### «НоваКаша — сіла наша!»

**Філіял «Навабеліцкі камбінат хлебапрадуктаў» спецыялізуецца на вытворчасці камбікармоў для ўсіх відаў жывёлы, а таксама на прадуктах харчавання і з'яўляецца адным з лідараў у нашай рэспубліцы па гэтым кірунку. Прычым не проста прадуктаў, а хуткага іх прыгатавання, экалагічна чыстых і багатых карыснымі рэчывамі.**

**Асартымент іх сапраўды багаты — каля сарака найменняў. Тут і аўсяныя і ячныя крупы, розныя кашы з фруктовымі, гароднiннымі і іншымі сухімі дабаўкамі, аўсяныя, ячменныя, жытнёвыя, грэцкія шматкі хуткага прыгатавання... Усё не пералічыш.**

**Гандлёвая марка продажу іх — «НоваКаша» — добра вядомая ў нашай рэспубліцы і карыстаецца павышаным попытам. Як расказаў нам начальнік крупянога комплексу Мікалай Паўлянок, зараз запасаў гатовай прадукцыі на складах няма, ды і раней такіх выпадкаў не назіралася. Ён пазнаёміў нас з работай фасовачных аддзяленняў, дзе ўстаноўлены тэхналагічныя лініі італьянскай, нямецкай і расійскай вытворчасцяў. Тут сапраўды было на што паглядзець. Працуюць яны выдатна.**

**Вось адна з іх, эксклюзіўная, зробленая пад заказ філіяла ў італьянскай фірме «Сензані». За пультам фасовачнай машыны — машыніст Арцём Майсеенка, які яе абслугоўвае. Машына працуе на так званых гатовых высечках (будучых каробках), кожны з якіх «прысмоктваецца» да спецыяльнага прыстасавання, разварочваецца на лініі і выносіцца на прадольны транспарцёр. Лазерны прынтар наносіць на дно каробак клей, і тыя аўтаматычна зварочваюцца, набываючы патрэбную форму, заклейваюцца і рухаюцца далей па транспарцёры. А вось і аб'ёмныя дазатары наперадзе, якія кожную каробку дазіруюць прадуктам, што паступае зверху (а гэта могуць быць і гарох, і аўсяныя ці пшанічныя шматкі). Каробкі праходзяць па кругу да клеявога прыстасавання, што на процілеглым баку лініі, пасля чаго кожная з іх накіроўваецца на ўзважванне. Калі адхіленне вагі больш ці менш за тры працэнты запраграмаванай вагі, каробка аўтаматычна выкідваецца з працэсу. А «нармальныя» паступаюць на так званую групавую ўпакоўку. Вось і ўсё. Поўная аўтаматызацыя.**

**Гэта толькі адзін прыклад таго, што філіял рабіў і робіць стаўку на сучасныя ўнікальныя тэхналогіі, клапоціцца аб задавальненні попыту спажыўцоў на сваю прадукцыю, якая маркіруецца знакам «НоваКаша» і адпавядае лепшым сусветным узорам. «Казырным тузом» яе з'яўляецца натуральнасць прадукту, карыснасць яе, непаўторнасць густу. Яна заваявала давер пакупнікоў.**

**Нездарма такі поспех, бо дакладна дзейнічаюць на прадпрыемстве сістэмы менеджменту якасці, кіравання навакольным асяроддзем, аховы працы, кіравання якасцю, а таксама бяспекі харчовай прадукцыі на аснове аналізу рызык і крытычных кантрольных кропак у адпаведнасці з патрабаваннямі СТБ 1470-2004.**

**Нездарма выдатная работа прадпрыемства неаднаразова пацверджана сертыфікатамі і дыпломамі, сярэбранымі і залатымі медалямі на міжнародных конкурсах і выстаўках-кірмашах. Нездарма ўсе без выключэння найменні пад знакам «НоваКаша» атрымалі ганаровыя «залатыя» ўзнагароды на Маскоўскай міжнароднай выставе-кірмашы «Усерасійская марка. Знак якасці XXI стагоддзя».**

**«НоваКаша» — сіла наша!**

